РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. СЕРАДА № 209 (30597)



Фота БелТА.

# «МЫ НЕ ПРОСТА НАЗІРАЛЬНІКІ, А ПРАМЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ ГЕАПАЛІТЫЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ У САМЫМ ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ»

**На III Мінскай міжнароднай канферэнцыі па еўразійскай бяспецы гаварылі аб тэмах, важных для ўсяго чалавецтва. Прамова Прэзідэнта Беларусі — моцны сігнал усім, хто зацікаўлены ў міры.**

СТАР. 2–6



ТЭХНІКА З ПЕРСПЕКТЫВАЙ

8–9

## АДВЕСЦІ АД УДАРУ

**Як у МНПЦ хірургії, транспланталогії і гематалогії ставяць людзей на ногі пасля інсультаў**

Паводле даных Еўрапейскай арганізацыі інсультаў (ESO), па выніках 2023 года беларуская сістэма аховы здароўя ўваходзіць у топ-5 у рэйтынгу па дапамозе пацыентам з інсультам сярод краін Еўропы. Адным з вядучых у Беларусі цэнтраў па лячэнні інсультаў з'яўляецца Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі. З пачатку года тут дапамаглі больш за 1,6 тысячы пацыентаў з інсультамі.



СТАР. 8–9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25209>

9 771990 763008

# «МЫ НЕ ПРОСТА НАЗІРАЛЬНІКІ, ГЕАПАЛІТЫЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ

## Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі




> **Нам трэба шукаць развязкі праблемных момантаў. Адкрыта, з накіраванасцю на вынік, але з улікам нашых інтарэсаў**

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!

Дзякую вам за тое, што вы запрасілі мяне выступіць на нашай канферэнцыі. Найперш я хачу вітаць вас у беларускай сталіцы ўжо на трэцяй міжнароднай канферэнцыі па еўразійскай бяспецы. Канферэнцыю чакалі не толькі мы, удзельнікі, але і, зразумела, нашы апаненты, якія ўважліва сёння назіраюць за Мінскам. Не ўсе сёння павінны былі дабрацца да Мінска. Менавіта такую мэту мелі некаторыя нашы суседзі, правярнуўшы гэту вар'яцкую аферу з закрыццём граніц. І нагоду прыдумалі абсурдную. Паветраныя шары. Нават для такой дробнай краіны, як Літва, гэта дробна.

Ну і ўжо «самыя вялікія» ад нас патрабуюць прабачэнняў. Вось я раніцай атрымаў падобную інфармацыю. Ведаеце, калі вінаваты, трэба заўсёды прасіць прабачэння. І, калі мы будзем перакананыя ў тым, што мы вінаватыя, нас пераканаюць у гэтым (спрабуюць цяпер пераканаць), мы публічна гатовы гэта абмяркоўваць, мы папросім прабачэння. Гэта дакладна. Але, калі туды ляцяць нейкія шарыкі паветраныя з цыгарэтамі ці яшчэ з нечым, я мяркую, што трэба вырашаць гэта пытанне там. Яны ж не проста паляцелі невядома куды. Іх хтосьці там прыняў ці прымае. Хтосьці ў гэтым зацікаўлены. Трэба знайсці і ў корані спыніць падобныя рэчы. Ну гэта так, на злобу, бо ўпэўнены, што вы гэта пытанне адсачылі.

Адказна заяўляю, што ні пра якую надзвычайную кантрабанду гаворкі няма. Але гэта шмат гаворыць пра палітычны патэнцыял нашай канферэнцыі, калі яе спрабуюць блакіраваць.

Так званы цывілізаваны свет прыйшоў да свайго заняпаду. Гэта сапраўды. Дзеянні не толькі нашых суседзяў, але і ў цэлым Еўропы і іншых сіл (не трэба цешыць сябе і па Злучаных Штатах Амерыкі) — такі ж элемент гібрыднай вайны, як і нядаўняе закрыццё граніцы Варшавай. Ну да чаго гэта прывяло? Кітайская Народная Рэспубліка разам з Расіяй знайшлі абходныя, як кажуць, шляхі. Па Паўночным марскім шляху ўзмацніўся рух тавараў, і адбыліся вялізныя ў выніку гэтага страты — не толькі Беларусі (мы нешта зараблялі на транзіце), але і Польшчы. Яна ад гэтага транзіту кітайскага (я толькі аб кітайскім кажу) зарабляла 65—70 %. Астатняе — рух тавараў па Казахстане, Расіі і праз Беларусь — 30—35 % — прыпадала на нашы краіны. Хто ад гэтага страціў? Зразумела хто. Цяпер спрабуюць знайсці выйсце з гэтага становішча. Наўрад ці. Вы ведаеце, што такое Кітай, і ведаеце іх падыходы ў гэтым плане.

Вось гэта XXI стагоддзе: зачыненае неба, калючы дрот, поўнае непрыманне іншадумства. І гэта толькі пачатак. Яны баяцца як агню таго, што тут прагучыць альтэрнатыўны пункт гледжання. Яны баяцца ўсіх нас, вас, вашай аналітыкі, вашага ведання сітуацыі, умення данесці яго да людзей, вашага голасу. А вы, нягледзячы ні на што, я вам за гэта ўдзячны, прыехалі ў Мінск. У Мінску мы заўсёды рады вас бачыць.

***З кожным годам канферэнцыя становіцца ўсё больш запатрабаванай, яна ўжо заняла сваё месца ў календары міжнародных падзей. Сёння ўдзельнічаюць прадстаўнікі 48 краін, у мінулым годзе было 38. Чаму?***

**Па-першае.** Дзе яшчэ адкрыта і сумленна абмяркоўваць фундаментальныя пытанні бяспекі на нашым агульным кантыненце? У Мюнхене? Магчыма. Але там хочуць бачыць і чуць толькі тых, хто мінуў праз «ідэалагічнае сіта», у чым нас папракаюць.

Была б іх воля, у наступным годзе, мабыць, зыходзячы з таго, што мы бачылі на мінулай канферэнцыі, і амерыканцаў бы туды не пусцілі. Раптам тыя зноў скажуць праўду пра «еўрапейскі сад»: пра страчаныя каштоўнасці, утрыманства, крывадушнасць, цэнзуру і двайныя стандарты.

**Па-другое.** У сферы бяспекі, на жаль, па-ранейшаму застаецца каласальная колькасць праблем, якія патрабуюць абмеркавання, і самае галоўнае — пошуку шляхоў вырашэння.

За апошні час атрымалася выйсці на развязкі (я вельмі спадзяюся, доўгатэрміновыя) па некалькіх застарэлых канфліктах: Азербайджан і Арменія падпісалі мірны дагавор, спынілася двухгадовая вайна ў Газе. Але гэта толькі пачатак. Спадзяёмся, што добры пачатак.

У астатніх гарачых кропках пробліскаў надзеі няма. На мінулай канферэнцыі я прыводзіў прыклад, што ў свеце ідзе каля 50 узброеных канфліктаў рознай інтэнсіўнасці. Максімальная колькасць з моманту заканчэння Другой сусветнай вайны! Ну што тут дзівіцца, што Трамп прадухіліў нібы шэсць ці сем канфліктаў і войн. 50 ідзе! Не так шмат (спыніў Дональд Трамп. — **«Зв.»**).

Растуць жорсткасць, колькасць ахвяр, бежанцаў, эканамічныя страты. Асобным выклікам становяцца нібыта стыхійныя рэвалюцыі пакалення Z (памятаеце, Бангладэш, Непал, Мадагаскар?).

І галоўная прычына адсутнасці прагрэсу ў глабальнай дээскалацыі — паслядоўнае ігнараванне прынцыпу непадзельнасці бяспекі.

> **У выніку міжнародныя адносіны сёння даводзіцца характарызаваць не ў катэгорыях даверу і супрацоўніцтва, а аперыруючы данымі аб кіламетрах новых загарод і мегатонах смяротных узбраенняў. За такой небяспечнай матэматыкай — лёсы ўжо не асобных людзей, а ўсяго чалавецтва ў цэлым!**

Ігнараванне простай ісціны, што бяспека адной дзяржавы не можа будавацца за кошт іншай, — гэта трагічная памылка, калі не сказаць фатальная. Драматычныя падзеі ва Украіне, на Блізкім Усходзе — таму прамое пацверджанне.

Заходнія палітыкі да гэтага часу знаходзяцца ва ўпэўненасці, што сілай могуць прымусіць усіх прытрымлівацца сваіх інтарэсаў. А хто не прагнецца — таго ізалююць. Вось толькі яны не хочуць зразумець і прыняць сённяшнюю рэальнасць.

Іх палітыка незаконных санкцый і новых раздзяляльных ліній — ці то гэта ідэалагічныя бар'еры, ці то закрыццё граніцы, неба — прамая дарога да самаізаляцыі ад таго свету, да якога мы імкнёмся. Свету, які зрабіў крок наперад, у якім на першыя пазіцыі выходзіць разуменне неабходнасці бесканфліктнага суіснавання, цярпімасці і павагі да адрозненняў. Адным словам, свету, у якім Глабальная большасць усвядоміла сябе паўнавартасным і паўнапраўным удзельнікам. Упэўнены, гэты працэс будзе працягвацца.

> **А ў краін на еўразійскай прасторы ёсць усё, каб садзейнічаць развіццю адна адной. Гэта ж вялізны рынак, багатыя рэсурсы, высокія тэхналогіі і бясцэнны чалавечы патэнцыял!**

Нам трэба шукаць развязкі праблемных момантаў. Адкрыта, з накіраванасцю на вынік, але з улікам нашых інтарэсаў.

Давайце будзем шчырыя, калі ўжо тут сабраліся. Вось мы кажам: Глабальная большасць, Еўразійскі кантынент — мы можам многае, нас шмат, многае можам зрабіць. Гэта сапраўды так. Але самая вялікая праблема — мы ў гэтым кірунку не тое што нічога не робім, мы вельмі слаба рухаемся ў гэтым кірунку. Мы ўсе разумеем, што мы не можам увесь час хадзіць, сагнуўшы калені, і прагінацца пад адну краіну ці аднаго чалавека. Мы гэта цудоўна разумеем.

Увёўшы сёння санкцыі... Ладна, санкцыі. Колькі гэтых санкцый ужо ўводзілі апошнім часам! Але ўжо дайшлі да крадзяжу — таго, да чаго нас заўсёды падштурхоўвалі. Вазьміце золатавалютныя рэзервы Расіі, Беларусі, можа, яшчэ некага. Але яны ж (заходнія краіны. — **«Зв.»**) заўсёды былі за тое, каб мы свае золатавалютныя рэзервы захоўвалі дзе? Калі ў нас дома ЗВР — гэта не ЗВР. Трэба абавязкова кудысьці вывезці ў першакласныя банкі, у самавітыя дзяржавы. Вывезлі. І што? Ужо дайшлі да таго, што пачалі без пакут сумлення браць гэтыя грошы, як свае, і накіроўваць туды, куды лічаць патрэбным.

Ідзе яшчэ невялікая гульня: ах, Бельгія нешта хоча ці не хоча, Злучаныя Штаты Амерыкі... «А раптам забяром гэтыя рэзервы (чытай: расійскія) — міжнароднае права рассыплецца». Ды Гасподзь з вамі, яно ўжо даўно рассыпалася. Проста ідзе гульня. Адурманіць спрабуюць нас (нас немагчыма, мы — людзі дасведчаныя) і людзей у свеце. Даўно гэта пытанне вырашана. Бандытызм і крадзеж.

Я гэта кажу да таго, што трэба неяк рэагаваць. Аб тым я гаварыў, па-мойму, на вялікай канферэнцыі ШАС у Кітаі і ў іншых краінах. На гэта трэба рэагаваць. Калі амерыканцы не жадаюць, каб мы выкарыстоўвалі іх долар (на гэтым яны нядрэнна жывуць), добра, значыць, трэба рухацца да таго, каб ствараць альтэрнатыўную валюту.

Калі мы бачым, што сёння яны вядуць барацьбу ўсе разам (хтосьці таксама гуляецца там і гэтак далей), але мэта іх зразумелая (тыя, хто гісторыяй займаўся, тым больш гэта разумеюць), што рана ці позна яны ўсё роўна прыйдуць да той палітыкі, якую заўсёды праводзілі.

Вельмі баюся, што пазіцыя амерыканцаў у дачыненні да Расіі па ўкраінскім канфлікце —

# А ПРАМЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ У САМЫМ ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ»

## на III Мінскай міжнароднай канферэнцыі па еўразійскай бяспецы

гэта таксама спектакль, які разыгрываюць. Апошнія даныя пра гэта ўсё больш і больш сведчаць. Не хацелася б. Хацелася б, каб мы скончылі гэту вайну так, як належыць. І гульні тут быць не можа. Бо, як кажа той жа Трамп, гіне шмат людзей. Але гэта размовы.

Усе мы разумеем, што гэтыя санкцыі могуць быць сёння супраць іншых краін. Вось Індыя не паслухаецца і далей будзе закупляць нафту не там, дзе трэба, — могуць і супраць яе ўвесці санкцыі. Паўтара мільярда з лішнім чалавек! Усе разумеюць, што заўтра і ваенным шляхам (паглядзіце на Венесуэлу) могуць націснуць. Усе разумеюць, што да гэтага можам прыйсці. Ну дык давайце аб'яднаемся, давайце будзем ствараць нейкую альтэрнатыву, пачынаючы з разлікаў і заканчваючы пэўнай дэманстрацыяй нашых магчымасцяў. А яны ёсць.

Такія магчымасці ёсць, але мы гэтага не робім. Усё чакаем, калі з намі разбяруцца паасобку. Таму, ківаючы на Захад, трэба зрабіць адпаведную выснову аб тым, што і мы не заўсёды добрыя ў гэтых адносінах, мы не робім тое, што трэба зрабіць сёння. А калі мы не зробім гэтага сёння, заўтра будзе позна. Магчыма, позна.

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!

Мы вельмі хочам з аптымізмам глядзець у будучыню еўрапейскай і, шырэй, еўразійскай бяспекі. Але фактычныя працэсы і з'явы, якія мы назіраем, пакуль не даюць для гэтага сур'ёзных падстаў. Хутчэй, наадварот.

Мы не раз папярэджвалі: нельга беспакарана дзяліць агульную прастору даверу. Цяпер усім даводзіцца пажынаць плён такой блізарукай палітыкі. Разбураюцца міждзяржаўныя масты, якія ствараюцца дзесяцігоддзямі. Знікаюць рынкі, якія, умоўна кажучы, кармілі цэлыя рэгіёны. Рвуцца міжчалавечыя сувязі, якія здаваліся трывалейшымі за рознагалоссі палітыкаў.

**А калі ў дзяржаў знікаюць надзейныя дагаворныя асновы бяспекі і не працуюць меры даверу, узрастае роля інструментаў, у тым ліку ядзернага стрымлівання. Бо нельга забяспечыць сваю бяспеку, калі яе юрыдычныя і палітычныя гарантыі растаптаны, калі суседнія краіны імкнуцца так нарасціць свой ваенны патэнцыял, каб ён пераўзыходзіў твой уласны. І не саромеюцца ў агрэсіўнай рыторыцы.**

Пытанне: навошта? У мяне толькі адзін адказ: на жаль, каб грамадства ўсё больш прывыкала да думкі аб вайне.

Апошнім часам нас і Расію папракаюць, што, вось, «заўтра-заўтра-заўтра...» Ну калі мы не адцяпаем Польшчу, а можа быць, Прыбалтыку, а можа быць, усе разам... Ну, як мінімум, Сувалкскі калідор, як яны часта кажуць, праб'ём. Я гэта чую, колькі працую Прэзідэнтам. Доўга працую і гэта ўсё чую. Лухта поўная. Нам бы разабрацца з тымі праблемамі, калі шчыра казаць, якія ў нас ёсць. Нікуды мы не нацэлены, ніякая Еўропа, Парыж і Лондан нам не патрэбны. Нават Літва і Польшча, нават Вільнюс і Варшава. Яны нам не патрэбны. Нам не патрэбная гэтая эскалацыя.

Тады чаму да 5 % ВУП палякі выдаткоўваюць на зброю? І нават Літва (мы ж бачым, якія працэсы ўнутраныя там адбываюцца) — яны павялічваюць і без таго бедны бюджэт, адрываюць на ўзбраенне. Навошта? Першае пытанне.

Другое пытанне: навошта гэта ўся рыторыка? Мусіць, яны самі рыхтуюцца да гэтага. Таму я вам шчыра і праўдзіва кажу. Я казаў гэта і Прэзідэнту Расіі, і іншым кіраўнікам дружалюбных дзяржаў.

Мы кожны дзень рыхтуемся да вайны, каб яе не было. У той жа час, калі Польшча і Прыбалтыка хочуць з намі супрацоўнічаць — па-чалавечы... Не таму, што тры шары заляцелі або беспілотнікі (як аказалася, украінскія), пра якія мы папярэдзілі палякаў. Мы не змаглі іх усе знішчыць — мала часу было, і гэта заўсёды складана. Мы ім паведамілі. Яны ўдарылі па сваіх дамах сваёй ракетай. Спачатку абвінавацілі нас і Расію, а потым (дзякуй амерыканцам) сказалі, што не, гэта, відаць, не расійская ракета. Выявілі, што не расійская.

Вось так ідзе нагнятанне. І заўсёды паўстае пытанне: ну навошта вы гэта робіце, навошта нагнятаеце? Я на гэтае пытанне адказваў.

Падпісаны ў мінулым годзе Дагавор аб гарантыях бяспекі ў рамках Саюзнай дзяржавы прадугледжвае выкарыстанне любых відаў узбраенняў, уключаючы ядзерныя. Для абароны! Яшчэ раз падкрэсліваю: гэты крок носіць выключна абарончы характар і зроблены ў строгай адпаведнасці з міжнародным правам і палажэннямі Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі.

Яшчэ адно пытанне, якое бударажыць асобных ашалелых палітыкаў, — размяшчэнне ў Беларусі ракетнага комплексу сярэдняй далёкасці «Арэшнік». Ніякай агрэсіўнасці! Ніякай!

Як доказ. Успомнім гісторыю. 1987 год: СССР і ЗША пасля доўгіх перагавораў падпісалі Дагавор аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці. Гэты дакумент стаў найважнейшым элементам сістэмы па прадухіленні ўзаемнага знішчэння на той момант супрацьлеглых блокаў. Аднак у 2019 годзе Злучаныя Штаты з яго выйшлі. Быў зроблены трагічны крок назад.

Шэсць гадоў таму, выступаючы ў гэтай зале на міжнароднай канферэнцыі, я прапанаваў распрацаваць шматбаковую палітычную дэкларацыю аб неразмяшчэнні ракет сярэдняй і меншай далёкасці ў Еўропе, зрабіць яе адкрытай для далучэння ўсіх зацікаўленых дзяржаў. На жаль, прапанову Беларусі проста не захацелі пачуць. І зразумела чаму. Яшчэ, можа, таму, што «ну што там Беларусь...» Гэта ж не Кітай, не Індыя, не тыя рэсурсы, напэўна, не тое значэнне. Мы яшчэ гэтымі катэгорыямі думаем.

**Шэраг еўрапейскіх краін ужо заявілі аб намеры разгарнуць у сябе ракетныя комплексы сярэдняй далёкасці. Чаго нас папракаць? А гэта — адзін з самых небяспечных відаў узбраенняў! Падлётны час — хвіліны. У выпадку памылкі або правакацыі часу разбірацца проста не будзе.**

Так што размяшчэнне гэтай зброі ў Беларусі не што іншае, як мера ў адказ на эскалацыю сітуацыі ў рэгіёне і сучасныя пагрозы. Калі ласка: давайце ад гэтага адыдзем, і размовы пра «Арэшнік» спыняцца. Але не хочуць. Мы нікому не пагражаем, толькі забяспечваем, як я сказаў, сваю бяспеку. Больш за тое, заўсёды адкрыты да канструктыўнага дыялогу і ўзаемных крокаў па зніжэнні напружанасці. Калі нашы партнёры на Захадзе да гэтага гатовы, ні мы, ні Расія, перакананы, у даўгу не застанёмся.

Але пакуль складваецца ўражанне, што Еўропе мір не патрэбны. Палітыкі забыліся, якія жахі прынесла Другая сусветная вайна. Паверылі, што нарошчванне ваеннага патэнцыялу іх засцеражэ. Не, не і яшчэ раз не! Гэта шлях у нікуды, чарговая прыступка па лесвіцы эскалацыі.

Нягледзячы на ўсе нашы заклікі, дыялог з еўрапейскімі краінамі па бяспецы, кантролі над узбраеннямі і мерах даверу цалкам адсутнічае. Красамоўны прыклад з Дагаворам па адкрытым небе. Нам выстаўляюць надуманыя прэтэнзіі аб невыкананні дакумента, але пры гэтым цалкам адмаўляюцца ад якога-небудзь узаемадзеяння.

*(Працяг на 4–5-й стар.)*



# «МЫ НЕ ПРОСТА НАЗІРАЛЬНІКІ, ГЕАПАЛІТЫЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ

Добра, адмовіліся ад пратэстанцкай этыкі, каб дагадзіць ЛГБТ, але дзе ж праславутая заходняя рацыянальнасць? Няўжо там не разумеюць, што кантроль над узбраеннямі і меры па ўмацаванні даверу невымерна больш выгадна і танна, чым гонка ўзбраенняў? І гістарычны выбар просты — разрадка ці эскалацыя. Таму давайце адразу выбіраць разрадку. Чым раней мы гэта зробім, тым лепш будзе і для нас, і для будучых пакаленняў.

У дадатак Захад у пастаяннай звыклай логіцы двайных стандартаў спрабуе штучна абвінаваціць Беларусь у прымяненні міграцыі як зброі. Выразна і адназначна заяўляю: мы не займаемся і не збіраемся займацца выкарыстаннем міграцыйных працэсаў ні ў якім выглядзе.

І давайце рэчы называць сваімі імёнамі. Міграцыя — гэта ў першую чаргу вынік крызісаў, вынік разбураных эканомік, разарваных сацыяльных сувязяў і знішчаных дзяржаўных інстытутаў у Афрыцы, на Блізкім Усходзе, у шэрагу іншых краін у выніку бездказнай палітыкі таго ж калектыўнага Захаду.

**Калі вы дэстабілізуеце і бамбіце іншыя краіны, выпампоўваеце іх рэсурсы і ставіце пад пагрозу іх будучыню, чаго вы чакаеце? Што людзі застануцца на руінах сваіх дамоў? Не, яны паедуць туды, дзе, як спадзяюцца, ёсць хоць бы адносная бяспека для іх і іх дзяцей. І скажыце гэтым няшчасным, што яны не маюць на гэта права.**

Хачу задаць пытанне: назавіце мне хоць бы адну прычыну, чаму Беларусь павінна абараняць Еўрапейскі саюз, Еўропу ад мігрантаў. Чаму?

Па-першае, ва ўмовах усёабдымнага санкцыйнага ціску ў нас няма ні лішніх рэсурсаў, ні маральных абавязацельстваў вырашаць праблемы тых, хто гэтыя санкцыі ўвёў. Слухайце, нас душаць санкцыямі і кажуць: «Абараняйце нас!»

Але мы былі сумленныя. Як толькі ўвялі санкцыі і разарвалі з намі адносіны па пытаннях міграцыі, я ім сумленна і адкрыта сказаў: «Усё, рабяты, мы лавіць тут нікога не будзем і абараняць не будзем». Не, мы не будзем дапамагаць нікому — людзі знойдуць сваю дарогу самі туды, куды іх паклікалі.



Па-другое, уся інфраструктура, усе праекты прыгранічнага супрацоўніцтва былі ў аднабаковым парадку згорнутыя нашымі заходнімі суседзямі.

Па-трэцяе, на Захадзе іх (мігрантаў. — **«Зв».**) туды паклікалі. Памятаеце, заява другой ці трэцяй эканомікі свету? Ангела Меркель (экс-канцлер Германіі. — **«Зв.»**): «Прыязджайце, няма каму працаваць!»

Ну дык калі яны да вас прыехалі (мігранты таксама да нас прыязджаюць), вы ім стварыце роўныя ўмовы са сваімі людзьмі. У іх трэба бачыць людзей. Мы так і робім. Вось тыя, хто да нас прыязджае, — няважна, з нашай роднай Расіі пераехалі (гэта нават не мігранты), з Казахстана (таксама нашы людзі), з Арменіі, іншых краін, ці з Афганістана, Узбекістана і далей, — мы ім ствараем усе ўмовы, як у Беларусі. Бясплатная адукацыя за кошт бюджэту — вашы дзеткі вучацца разам з нашымі ў адной школе і бясплатна. За кошт бюджэту ахова здароўя ў Беларусі. І вам такое ж. Вы калінебудзь чулі, што ў нас мігранты здзейснілі нейкія злачынствы? Яны цэняць тое стаўленне, якое складваецца ў Беларусі ў адносінах да іх.

**Хто перашкаджае багатай Еўропе (як яны там казалі, сад ці што) зрабіць гэта? Трэба проста зрабіць. І тады яны будуць працаваць на вашых «Фальксвагенах» ці «Мерседэсах», збіраць і будаваць аўтамабілі, і праблем, можа быць, і не будзе. Але яны запрасілі і хацелі зрабіць з іх рабоў. Ну дык атрымлівайце!**

Як можна ўсур'ёз успрымаць патрабаванні Еўрасаюза да нас (як яны гавораць, «вырашыць праблему з мігрантамі»), калі тыя ж Брусель і Польшча з Прыбалтыкай дэманстратыўна разарвалі ўсе раней дасягнутыя пагадненні і адмаўляюцца падтрымліваць простую камунікацыю нават па бягучых пытаннях?

Ну неяк мы з палякамі не тое, што дамовіліся, а ўжо, мусіць, і настрoi ў Польшчы: польскі народ не дрэнны — прымусіў улады звярнуць увагу на міграцыю і паспрабаваць разабрацца. Слухайце, аж да Германіі створаны бандыцкія групы, якія высмоктваюць, выцягваюць гэтых мігрантаў (і рады гэтаму) з Беларусі і туды, у Германію, іх накіроўваюць. Вось у чым праблема! Немцы маўчаць. Ясна, чаму маўчаць. Але, сустракаючыся са службовымі асобамі Германіі, калі толькі мы пачынаем казаць аб міграцыі і Польшчы, яны заплюшчваюць вочы. Яны ведаюць, што адбываецца.

**Логіка простая: калі вы разбурылі масты, не патрабуйце ад нас наводзіць пераправы. Мы не будзем вас абараняць з пятлёй на шыі. Санкцыі — гэта пятля на шыі беларускага народа, і вы ад нас патрабуеце вас абараняць. Гэтага не будзе!**

*(Апладысменты.)*

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!

**Я перакананы: бяспеку нельга пабудаваць на пагрозах і ўльтыматумах. Гэта проста тупік. Без даверу, без супрацоўніцтва, без справядлівасці любая сістэма бяспекі застанецца вельмі зыбкай канструкцыяй. Чаму ж для Беларусі гэта тэма такая важная? Адказ відавочны. Мы не проста назіральнікі, а прамыя ўдзельнікі геапалітычных працэсаў у самым цэнтры Еўропы.**

І мы не наіўныя. Разумеем, што спробы стварыць значную ваенную перавагу на нашых граніцах (пра якія я казаў), падарваць нашу эканоміку і пастаяннае правакаванне сацыяльных узрушэнняў — гэта спосабы падпарадкаваць Мінск чужой волі. Будзем як зможам адказваць. У нас ёсць свае маг-

## Гавораць удзельнікі

**Ваенны аналітык, галоўны рэдактар часопіса «Национальная оборона», дырэктар Цэнтра аналізу сусветнага гандлю зброяй Ігар КАРОТЧАНКА** (Расія):

— На Мінскай міжнароднай канферэнцыі па еўразійскай бяспецы прагучалі важныя рэчы, якія маюць значэнне для разумення ходу будучых падзей і вектараў развіцця. Аб'ектыўна Мінск — сёння тая пляцоўка, дзе Усход можа размаўляць з Захадам. Можа быць, адзіная акрамя пляцоўкі ААН. І ў гэтым плане галоўны інтарэс заключаецца ў тым, каб зверыць свой пункт гледжання з меркаваннем вядучых сусветных аналітыкаў, якія прапаноўваюць сваё бачанне вырашэння крызісаў, што існуюць. Сённяшняя турбулентнасць, якая з'яўляецца вынікам бездказнай палітыкі найперш Захаду (канкрэтна Еўрасаюза, НАТА), патрабуе вывераных, дакладных рашэнняў. Без істэрыі, спакойна мы аналізуем абстаноўку і шукаем практычныя механізмы выхаду з таго тупіка, у які Захад загнаў сучасны свет сваёй бездказнай палітыкай. Пакуль ёсць шанц для здаровага дыялогу, у тым ліку з супрацьлеглым бокам, тымі заходнімі экспертамі, якія тут прысутнічаюць, мы будзем весці такі дыялог з разлікам на тое, што наш пункт гледжання будзе пачуты. Мы зможам выйсці на тыя ці іншыя прагматычныя меркаванні, якія адвядуць свет ад рызыкі Трэцяй сусветнай вайны.

**Прафесар філасофіі і геапалітыкі Ларэнца Марыя РЫЧЫНІ** (Італія):

— Вынікі Мінскай канферэнцыі па еўразійскай бяспецы будуць дыктаваць умовы ўсім структурам бяспекі Еўразіі. Удзельнікі канферэнцыі выступаюць супраць гегемоніі англасаксонскіх дзяржаў, якія хочуць дыктаваць гэтыя ўмовы. Уся структура бяспекі, што выбудоўваецца ў Еўразіі, мае вялікае значэнне для Глабальнага Поўдня. Пазіцыя Беларусі наконт устанаўлення міру ў рэгіёне надзвычай важная, яна мае гістарычную сувязь. Беларусь выступае і як партнёр, і як пасрэднік паміж краінамі Далёкага Усходу, Глабальнага Поўдня і астатняй часткай Еўразіі. Дыпламатыя, якую апошнія некалькі гадоў выкарыстоўвае Беларусь на міжнароднай арэне, эфектыўная. Ініцыятывы, што прапаноўвае ваша краіна, уплываюць на змяненне структуры міжнароднай бяспекі.

**Прафесар палітыкі і міжнародных адносін Белградскага ўніверсітэта Срджан ПЕРЫШ** (Сербія):

— Міжнародныя адносіны сёння вельмі дрэнныя. Хто вінаваты? Захад, ЗША, НАТА, Еўрасаюз. Вінаватыя таму, што хочуць геапалітычную гегемонію ў Еўразіі. А многія з іх не знаходзяцца на гэтым кантыненце. Асноўная задача ўсіх краін Еўразіі — стварыць саюз па бяспецы. Магутнасць Захаду зніжаецца, усе краіны Еўразіі павінны разумець, што цяпер гэта самая вялікая частка свету. Усе цывілізацыі, акрамя заходняй, знаходзяцца ў Еўразіі. Мультыпалярнасць, саюз цывілізацый павінны быць на першым месцы. Толькі яны павінны ствараць бяспеку ў Еўразіі. Без ЗША, без НАТА. Трэцяя міжнародная канферэнцыя па еўразійскай бяспецы ў Мінску з'яўляецца крокам да гэтага.

# А ПРАМЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ У САМЫМ ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ»

чымасці. У нас ёсць апора ў асобе брацкай Расіі. У нас ёсць падтрымка краін Глабальнай большасці.

Але мы прынцыпова не шукаем канфрантацыі. Неаднаразовыя заклікі Беларусі да аднаўлення дыялогу — гэта імкненне вярнуць цвярозы розум у міжнародныя адносіны, у якіх яго спрабуюць падмяніць сілай.

Выратаваць Еўразію можа толькі адмова ад канфрантацыі. Каштоўнасць нашага кантынента заключаецца ў яго ўзаемазвязанасці, таму яго нельга бясконца і беспакарана дзяліць на варагуючыя лагеры.

Я ўпэўнены, што ідэя мірнага сумеснага развіцця з'яўляецца тым самым стратэгічным арыенцірам, той мэтай, да якіх мы павінны імкнуцца. Менавіта на гэтых прынцыпах будуюцца такія магутныя структуры, як ШАС, БРІКС, ЕАЭС, СНД.

Я ўжо казаў пра аб'яднальныя ініцыятывы Расіі і Кітая, пра новы, цвярозы погляд амерыканцаў (дай бог, каб гэта было так, а не спектакль). Гэта не значыць, што я спрабую штучна выключыць з гэтага працэсу Еўропу. Гэта немагчыма!



У шматпалярным светаўладкаванні, якое зараджаецца, найважнейшае месца павінен заняць Еўрапейскі саюз. Моцны Еўрапейскі саюз. Мы ў гэтым перакананыя, і мы да гэтага неаднаразова заклікалі. Гэта адна з апор, асноў нашай сістэмы — планетарнай сістэмы, на якой трымаецца свет.

Але ці зможа Еўрасаюз заняць такое месца — пакуль пытанне. На сённяшні дзень Еўрасаюз відавочна знаходзіцца ў крызісе. Прычыны зразумелыя. Спачатку дзесяцігоддзямі выбудоўвалі сістэму ўнутранага рэгулявання ўсяго і ўсіх. Выбудавалі. Бізнес пачаў уцякаць.

Потым адмовіліся ад нармальнага ўзаемадзеяння з суседзямі на Усходзе, з Расіяй найперш. Агароджы на граніцы ўзвялі. Хутка ўвогуле замініруюць. І пачым цяпер энергія, напрыклад, у Еўрапейскім саюзе? Ці застаюцца сродкі, каб трымацца ў авангардзе інавацыйных распрацовак?

Але, баюся, у Брусэлі і шэрагу сталіц выбралі не вырашаць праблему па сутнасці, а прыкрыць будучай вайной. Няўжо разлічваюць на тое, што перавод эканомікі на ваенныя рэйкі гарантуе рост?

На пару гадоў нейкае боўтанне на адным узроўні, можа, і забяспечыць. Тлушч назапашвалі яшчэ з каланіяльных часоў. Але ж потым давядзецца разграбаць катастрафічныя наступствы.

Што атрымалі? Расце еўраскептыцызм. Іскрыць ва ўнутранай палітыцы. Узмацняюцца супярэчнасці паміж асобнымі дзяржавамі Еўрасаюза. Закладваюцца бомбы пад будучыню ўсёй вялікай Еўропы, а можа, і ўцэлым Еўразіі.

Кажу адкрыта і прама: калі стратэгічна нацэлены на нармальнае суіснаванне і вы не імкняцеся перарабіць нас, а мы — не будзем вас.

У нас свой менталітэт, свая культура, свой гістарычны этап развіцця грамадства. Ідэалагічнай, як і любой іншай, агрэсіі мы не прымаем. А напружаныя знешнія ўмовы вы ж нам і стварылі. Яшчэ і падрыўную дзейнасць вядуць. Купілі з вантробамі дзясяткі-другі нашых і расійскіх збеглых і малююць ім імідж ледзь не законнай улады ў Беларусі і Расіі. А потым крычаць: «Дыктатура! Пуцін, Лукашэнка — суагрэсары». Перажывём.

Цяпер да рэалістычнай размовы з Мінскам у Еўропе, здаецца, яшчэ не гатовыя. Не бачаць у нас перагаворных пазіцый, якія ёсць у шэрагу іншых краін, накшталт прыродных багаццяў. Але ў нас ёсць здаровы розум, вытрымка і яшчэ — рэсурс стратэгічнага становішча і здольнасць быць мостам, як гэта было заўсёды, паміж Захадам і Усходам. Я ж хачу зыходзіць з пераканання, што ў інтарэсах еўрапейцаў ляжыць як мінімум мірнае суіснаванне. Тады дыскусію перавядзём у плоскасць зусім іншых аргументаў — калі гэта не так, калі вы гэтага не хочаце.

Мы не лічым сябе вінаватымі ў пагаршэнні адносін з Захадам і яго асобнымі краінамі, але руку працягваем. Гэта не рука таго, хто просіць.

**Гэта рука партнёра, які мае ўласную годнасць, які прапануе разам шчыра працаваць дзеля міру для нашых дзяцей і ўнукаў.**

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!

У гэтым годзе Арганізацыі Аб'яднаных Нацый споўнілася 80 гадоў. «Хельсінкі», заключнаму акту, — 50. Тэму рэформы ключавых міжнародных інстытутаў мусоляць не адно дзесяцігоддзе, а праблемы не вырашаюцца.

Прыхільнасць Беларусі да справы міру — не пустая рыторыка, а аб'ектыўная неабходнасць. І не толькі мы, а ўвесь Еўразійскі кантынент да гэтага прыхільны, акрамя Захаду.

***Што мы прапануем?***

**Першае.** У адносінах да харчавання і медыкаментаў патрэбна забарона на ўвядзенне любых санкцый, у тым ліку другасных, таму што гэта звязана з вялізнымі стратамі, гібеллю людзей.

Вынік размахвання гэтай дубінай бачны ўсім: эканамічны крызіс, абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў, праваканне ўнутраных і міжнародных канфліктаў.

**Другое.** Абарона крытычнай міжнароднай інфраструктуры: газа- і нафтаправодаў, інтэрнэт-кабеляў, АЭС.

Забарона на дзеянні супраць гэтых аб'ектаў павінна быць адназначная. І ў гэтым зацікаўлены ўсе краіны свету, нават тыя, якія сёння трактуюць падрыў газаправода як подзвіг. У любых сітуацыях трэба абменьвацца данымі, забяспечваць іх фізічную недатыкальнасць і бесперабойную працу.

**Трэцяе.** Пераадоленне міграцыйнага крызісу. З тым, што Захад нарабіў у краінах выхаду, ён павінен разабрацца сам.

Што да наступстваў. Мы гатовы працаваць у тым фармаце, які доўгі час забяспечваў кантроль за сітуацыяй для абодвух бакоў.

Трэба дамаўляцца, напрыклад, у рамках глабальнай здзелкі. Падыход Прэзідэнта Трампа «ўсе на ўсе» мы можам абмяркоўваць і з ЗША, і з Еўропай, як любая іншая краіна.

Відавочна, што неабходна адзіная сістэма праверкі мігрантаў, узмацненне барацьбы са злачыннымі групоўкамі гандляроў людзьмі, паскарэнне працэдур дэпартацыі парушальнікаў.

**Чацвёртае.** Штучны інтэлект. Нарастаючая праблема. Некіравальная гонка ў гэтай сферы ператварае яго з карыснага рэсурсу ў зброю. У перспектыве — масавага паражэння.

Мы прапаноўвалі сумежным краінам стварыць пояс лічбавага добрасуседства. Час гэтым поясам аб'яднаць усю Еўразію і ўлічыць прынцыпы лічбавага суверэнітэту і нейтралітэту ў нашай будучай Хартыі шматпалярнасці і разнастайнасці ў гэтым стагоддзі.

Паважаныя сябры!

**Нам патрэбны дыялог. Нельга глядзець адно на аднаго праз прыцэл аўтамата. Ні ў якім разе нельга. Трэба заўжды размаўляць. Калі не размаўляюць, тады вайна бліжэй. Нам патрэбны гэты дыялог.**

Нам трэба спыніць гонку ўзбраенняў. Мы ўсе кажам, што «не, не, мы не будзем у яе ўцягвацца». Ды мы ўжо даўно ўцягнуліся ў гэту гонку ўзбраенняў. І, бачачы, якія сёння свет, дзяржавы апошнія грошы будуць траціць для таго, каб гарантаваць сваю бяспеку. А калі з патэнцыяльным агрэсарам не змогуць ваяваць, як Беларусь, — (будуць стараца. — **«Зв.»**) нанесці гэтаму праціўніку непрымальны ўрон.

Яшчэ раз, шаноўныя сябры, я дзякую вам за тое, што вы, нягледзячы ні на што, дабраліся да сталіцы Беларусі.

Я ўпэўнены, прагучыць шмат здаровых ідэй, якія нам сёння так патрэбны.

Але яшчэ больш патрэбнае для нас — дзеянні ў сувязі з тымі ідэямі, якія вы даўно выказваеце. Проста нельга дапусціць славабludства і перагаварэння нашых размоў у нішто. Пасля гэтага павінны быць дзеянні. Сёння такі перыяд, што мы павінны быць накіраваны на гэта.

Яшчэ раз дзякую вам, дарагія сябры, за тое, што вы мяне запрасілі. Жадаю вам усім прадуктыўнай работы.

*(Апладысменты.)*

**Фота БелТА.**

**Кіраўнік сектара Цэнтра сацыяльных даследаванняў Ільяс ГУСЕЙНАЎ** (Азербайджан):

— Мінская канферэнцыя па еўразійскай бяспецы — вельмі добрая платформа для дыскусій, абмену меркаваннямі. Бясконцыя войны і праблемы, якія назіраюцца ў свеце, патрабуюць вырашэння. Для разумення сітуацыі патрэбны дыялог, знаходжанне кансэнсусу, агульнага меркавання. Мінск аб'ядноўвае ўсе гэтыя намаганні. Галоўным прыярытэтам мінскай канферэнцыі з'яўляецца выпрацоўка Хартыі шматпалярнага свету. Гэта вельмі важна, бо трэба ўлічваць нацыянальныя інтарэсы, спецыфіку, ментальнасць розных рэгіёнаў, народаў. Эксперты прадстаўляюць пазіцыю сваёй краіны, таму ўсё гэта ўлічваецца ў будучыні. Беларусь спрабуе аб'яднаць усе намаганні дзеля міру. Мірныя ініцыятывы Мінска ўзмацняюць аўтарытэт краіны на міжнароднай арэне. Адкрытая беларуская душа жадае міру і бяспекі.

**Міжнародны эксперт Ева ТЫЧКОЎСКА** (Польшча):

— На змену русафобіі ў Польшчу прыйшла беларусафобія. Аднак усе палітычныя і эканамічныя рашэнні, якія прымаюцца ў нашай краіне, — на карысць Захаду, а не звычайных палякаў. Беларусы — цудоўныя людзі. Вы заўсёды за мір, за супрацоўніцтва з усімі краінамі. Вы — за тое, каб не было вайны, не было праблем. Беларусь меншая за Польшчу, але ўвесь час робіць стаўку на саюзніцкія адносіны, у тым ліку не адмаўляецца размаўляць і працаваць з намі. Беларусь заўсёды гаворыць пра каштоўнасці, дыялог і мір.

**Старшыня Працоўнай партыі Брытаніі Джордж ГАЛАУЭЙ** (Вялікабрытанія):

— Бяспека на еўразійскім кантыненце — праблема № 1 у сучасным свеце. Адсутнасць бяспекі пагражае існаванню чалавецтва. Мы жывём у эпоху, калі амерыканскія ваенныя самалёты высаджваюцца з авіяносцаў у Паўднёва-Кітайскім моры, а НАТА пагражае Трэцяй сусветнай вайной на Украіне, Вільнюс закрывае граніцу, а мы знаходзімся тут, у Мінску, дзе абмяркоўваем пытанні мірнага суіснавання. Гэта насамрэч ідэальная метафара для аблогавага становішча, якое навязала свету імперыя НАТА.

**Незалежны эксперт Кутатбек РАХІМАЎ** (Кыргызстан):

— Мінская міжнародная канферэнцыя па еўразійскай бяспецы — адна з найважнейшых пляцовак, якія ёсць на стыку Азіі і Еўропы. Тое, што фармулюецца ў Мінску, носіць важны характар, бо Беларусь з'яўляецца пагранічнай тэрыторыяй паміж Еўропай і Еўразіяй. З аднаго боку, Беларусь ужо зрабіла свой выбар як еўразійская краіна, уступіўшы ў ШАС, будучы актыўным удзельнікам усіх знакавых інтэграцыйных структур на постсавецкай прасторы. Адначасова Беларусь займае вельмі важную ролю ў агульнай канструкцыі ад Брэста да Уладзівастока. Прапановы вашай краіны, як правіла, актуальныя. Яны носяць своечасовы характар і месцамі нават апераджальны. Гэта немалаважна для разумення агульнай карціны таго, што адбываецца ў свеце.

ГАВОРАЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ

# ПАТРЭБЕН ДЫЯЛОГ, А НЕ КАНФРАНТАЦЫЯ

Сваім бачаннем на вырашэнне выклікаў і пагроз для забеспячэння бяспекі падзяліліся вышэйшыя службовыя асобы розных краін. У іх розныя меркаванні, разнастайныя прапановы, але аднолькавыя мэты. Бо галоўнай каштоўнасцю для ўсіх, нягледзячы на геаграфічнае знаходжанне, застаецца мірнае жыццё.

## «САНКЦЫІ НАНЕСЛІ БОЛЬШ СТРАТ САМОМУ ЕЎРАСАЮЗУ»



**Міністр замежных спраў і знешняга гандлю Венгрыі Петэр Сіярта** з трыбуны Мінскай канферэнцыі выказаў пазіцыю сваёй краіны: «Мы верым, што бягучая сітуацыя — гэта прычына, якая павінна паслужыць штуршком да аднаўлення актыўнага дыялогу. Дыялог павінен быць больш блізкі, чым калі-небудзь. І мы павінны спадзявацца і дамаўляцца ў імя міру». Тым больш што, канстатаваў еўрапейскі палітык, санкцыі нанеслі больш страт і шкоды самому Еўрасаюзу, эканомікам усіх краін. У сэрцы еўрапейскага кантынента назіраюцца пастаянныя праблемы.

«Еўрасаюзу варта вярнуцца да рацыянальнасці. Важнае змяненне — павінны вярнуцца да Еўразійскага дыялогу — гэта найважнейшая апора наогул дыялогу ў свеце», — заклікаў Петэр Сіярта. Ён запэўніў, што ўрад Венгрыі будзе прасоўваць ідэю еўразійскага дыялогу.

## «ЯНЫ НЕ ХАВАЮЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА НОВАЙ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ВАЙНЫ»



**Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў** у сваім выступленні зрабіў акцэнт на тым, што пашырэнне НАТА не спыняецца ні на хвіліну насуперак дадзеным яшчэ савецкім кіраўнікам запэўненням не прасоўвацца ні на мілю на ўсход. Ён звярнуў увагу: сёння ў Еўропе гучыць думка, што трэба задумацца аб новай сістэме еўрапейскай бяспекі. Але да гэтага дадаецца, што новая сістэма не павінна прадугледжваць удзелу Беларусі і Расіі. «Чаго толькі вартая ініцыятыва прэзідэнта Францыі аб так званай еўрапейскай палітычнай супольнасці, куды свядома адмовіліся запрасіць Расію і Беларусь, тым самым збудаваўшы нешта накшталт еўрапейскай часткі АБСЕ. Зразумела, што яны не хаваюць тую падрыхтоўку, якую яны вядуць на захад ад Саюзнай дзяржавы, да новай вялікай еўрапейскай вайны і ажыццяўляюць кааліцыйнае будаўніцтва з гэтай мэтай», — падкрэсліў кіраўнік расійскага знешнепалітычнага ведамства.

Ён таксама дадаў, што менавіта еўрапейскія члены НАТА зацягваюць узброены канфлікт ва Украіне, напампоўваючы краіну зброяй, аказваючы фінансавую і палітычную падтрымку. Спадзяёмся, што прэзідэнт Трамп па-ранейшаму шчыра імкнецца да вырашэння ўкраінскага крызісу з захаваннем пачатковых тых прынцыпаў, якія былі выпрацаваны на саміце ў Анкарыджы, прычым выпрацаваны на аснове амерыканскіх прапаноў», — дадаў Сяргей Лаўроў.

## «НІВОДНАЯ НАЦЫЯ НЕ ЗГОДНАЯ З ЦІСКАМ І ДАМІНАВАННЕМ АДНОЙ КРАІНЫ НАД ІНШЫМІ»



**Міністр замежных спраў КНДР Чхве Сон Хі** заявіла: яе краіна разглядае канферэнцыю як важны палітычны форум краін, што імкнуцца да незалежнасці і міру. «У заходняй частцы Еўразіі мы назіраем палітыку НАТА, накіраваную на стрымліванне Расіі, а супрацоўніцтва ЗША, Японіі і Паўднёвай Карэі ўзмацняе напружанасць. Бяспека ў свеце сёння пахіснулася шмат у чым з-за дзеянняў ЗША. Сітуацыя на Карэйскім паўвостраве і ў Паўночна-Усходняй Азіі застаецца нестабільнай. Мы бачым розныя вайсковыя вучэнні і дзеянні, накіраваныя супраць КНДР, уключаючы сцэнарыі магчымага ўжывання ядзернай зброі. Цяпер мы адчуваем пагрозу ядзернага канфлікту і пагрозу бяспецы нашага паўвострава. Ніводная нацыя не згодная з ціскам і дамінаваннем адной краіны над іншымі», — адзначыла яна ў сваім выступленні.

Чхве Сон Хі падкрэсліла, што ўрад КНДР імкнецца падтрымліваць дружалюбныя адносіны з усімі краінамі ў імя справядлівасці і незалежнасці і гатовы рабіць свой унёсак у пабудову шматпалярнага свету.

## «КІТАЙ — ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРЫЧЫН КРЫЗІСАЎ ПРАЗ ДЫЯЛОГ»

**Спецыяльны пасланнік урада Кітая па справах Еўразіі Сунь Ліньцзян** запэўніў, што Кітай выступае за дасягненне міру шляхам дыялогу. «Кітай і далей будзе падтрымліваць бакі ў ліквідацыі прычын крызісаў праз дыялог і кансультацыі, а таксама стварэнне збалансаванай, устойлівай структуры бяспекі», — адзначыў ён.



Сунь Ліньцзян падкрэсліў: «Вобразна кажучы, сістэма глабальнага кіравання цяпер знаходзіцца ў такім стане, як весла-ванне супраць плыні. Старшыня КНР Сі Цзіньпін агучыў на саміце ШАС у Цяньцзіні ініцыятыву глабальнага кіравання. Гэтая ініцыятыва грунтуецца на абароне мэт і прынцыпаў Статута ААН і практычнай рэалізацыі канцэпцыі сумесных кансультацый, будаўніцтва і выкарыстання».

## «АДКБ БУДЗЕ ЎДАСКАНАЛЬВАЦЦА»



**Генеральны сакратар Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Імангалі Тасмагамбетаў** расказаў, што па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праводзіцца работа над пралангацыяй дзеючай стратэгіі калектыўнай бяспекі АДКБ, якая была прынята на перыяд да 2025 года. «Яе сутнасць — захаваўшы найбольш важныя палажэнні дзеючага дакумента, прывесці яго змест у адпаведнасць з патрэбай эфектыўнага рэагавання на найноўшыя выклікі і пагрозы ў сферы калектыўнай бяспекі дзяржаў — членаў арганізацыі», — удакладніў ён. У гэтым кантэксце планууецца працягнуць нарошчванне баявога патэнцыялу войск Калектыўных сіл АДКБ, у тым ліку шляхам іх аснашчэння сучаснымі сістэмамі разведкі, радыёэлектроннай барацьбы і інш. Прадугледжана ўдасканаленне праграм падрыхтоўкі ваенных кадраў для Узброеных сіл дзяржаў — членаў АДКБ з улікам сучасных дасягненняў ваеннай навукі, тэхнікі і перадавога вопыту.

## «ШАС МОЖА ПАСЛУЖЫЦЬ ТРЫВАЛАЙ АПОРАЙ»



**Генеральны сакратар ШАС Нурлан Ермекбаеў** адзначыў: «Упэўнены, што ШАС як частка сеткі партнёрскіх арганізацый, якая паступова складваецца на прасторы Еўразіі, можа паслужыць трывалай апорай для фарміраванага шматпалярнага светапарадку, а таксама стварэння эфектыўнай глабальнай і рэгіянальнай сістэмы бяспекі».

**На канферэнцыі працавалі Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.**


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже земельных участков в частную собственность в г. Жодино

| Месторасположение земельного участка и кадастровый номер | Земельный участок по пер. Сосновому, 3 в г. Жодино, 641300000001003289 | Земельный участок по ул. Ломоносова, 22А в г. Жодино, 641300000003001419 |
|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 |
| Целевое назначение | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код по классификатору 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код по классификатору 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) |
| Площадь | 0,0820 га | 0,0965 га |
| Условия предоставления земельного участка, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | Без изменения целевого назначения снос существующих дикорастущих деревьев и кустарников | Без изменения целевого назначения снос существующих дикорастущих деревьев и кустарников |
| Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории | Возможность подключения к инженерным сетям: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, канализация, сети электросвязи | Возможность подключения к инженерным сетям: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, сети электросвязи |
| Ограничения в использовании | - | Площадью 0,0965 га – природные территории, подлежащие специальной охране (водоохранная зона), площадью 0,0014 га – охранная зона электрической сети, площадью 0,0129 га – охранная зона объектов газораспределительной системы |
| Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | 35 801,20 | 25 205,80 |
| Затраты | 4 136,21 + затраты на публикацию в СМИ | 4 303,38 + затраты на публикацию в СМИ |
| Сумма задатка, бел. руб. | 3 580,12 | 2 520,58 |
| Дата проведения аукциона | 27.11.2025 | 27.11.2025 |
| Последний день приема заявлений | 21.11.2025 | 21.11.2025 |
| Время проведения аукциона | 14.10 | 14.20 |

Подробная информация об объявленном аукционе размещена на официальных сайтах Минского облисполкома https://minsk-region.gov.by, Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/ и Жодинского горисполкома https://zhodino.gov.by/. **Контактный телефон для справок в г. Жодино 80177549093, 80177548574**



## ООО «Этерия групп» организует конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи) | Начальная цена (в бел. руб. эквивалентная по курсу НБ РБ на день проведения торгов) | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды | Расчеты за объект (в рабочих днях) момента заключения договора купли-продажи |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 27.11.2025 12.00 | Продажа квартиры с инв. № 500/D-708142039, по адресу: г. Минск, ул. Неманская, 2-1 | 216000 | 105,2 кв. м | 42 | 90 | В день |
| 27.11.2025 13.00 | Продажа квартиры с инв. № 500/D-708165009, по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 4-27 | 1050000 | 334,0 кв. м | 42 | 90 | В день |
| 27.11.2025 14.00 | Продажа квартиры с инв. № 500/D-669383, по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71/А | 129000 | 73,1 кв. м | 42 | 30 | В день |

Торги состоятся по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, пом. 1418, оф. п. 2. Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми к нему документами принимаются до 26.11.2025 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, пом. 1418, оф. п. 2. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже имущества ООО «Этерия групп», утвержденным приказом директора от 11.10.2025 № 7-ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов. Телефон для справок (+37529) 120-88-99.

УНП 193905687

# ПОПЫТ І ПРАПАНОВА

## Праз БУТБ рэалізаваны рэкордны аб'ём газасілікатных блокаў беларускай вытворчасці на ўнутраным рынку

**За дзве гандлёвыя сесіі заключана 31 біржавая здзелка агульным аб'ёмам амаль 63 тысячы «кубоў» на суму 7 мільёнаў рублёў — на дадзены момант рэкорд для гэтай групы тавараў, паведамілі ў прэс-службе Беларускай універсальнай таварнай біржы.**



Дарэчы, таргі праводзіліся ў супрацоўніцтве з Беларускай цэментнай кампаніяй з мэтай забеспячэння будаўнічых прадпрыемстваў неабходнымі матэрыяламі да канца 2025 года. У таргах удзельнічала каля 40 будаўнічых арганізацый, больш за палову з іх заключылі здзелкі, выкупіўшы значны аб'ём выстаўленага тавару. Вялікую ролю адыграла гнуткая коштавая палітыка БЦК, якая з улікам набліжэння «нізкага сезона» выйшла на таргі з канкурэнтаздольнай прапановай.

Як паведамілі ў БУТБ, з пачатку 2025 года прадстаўнікі беларускага будаўнічага сектара закупілі на біржы звыш 139 тысяч «кубоў» будаўнічых блокаў, што ў 2,7 раза больш, чым у студзені — кастрычніку 2024-га.

# ДАРЫ ВОСЕНІ

## Мінчане набылі на сельскагаспадарчых кірмашах звыш паўтары тысячы тон прадукцыі

Як паведаміла **начальнік Галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Алена НАГОРНАЯ**, па стане на 27 кастрычніка ў сталіцы прайшло ўжо 130 кірмашоў з нарастаючым вынікам.



Традыцыйныя ўдзельнікі кірмашоў — арганізацыі-вытворцы, спажыўкааперацыя, сялянскія фермерскія гаспадаркі і фізічныя асобы.

Набыць на такіх кірмашах можна бульбу, разнастайную агародніну, журавіны, арэхі, яблыкі, грушы і многае іншае — усё ў шырокім асартыменце.

Плануецца, што яны працягнуць дзейнічаць да 7 снежня. Аднак гэта будзе залежаць ад таго, наколькі спрыяльнымі акажуцца ўмовы надвор'я.

# НА КАРЫСЦЬ ЭКАНОМІК ДЗВЮХ КРАІН

## Прадпрыемствы сістэмы Мінпрама прымуць удзел у Міжнародным форуме-выстаўцы ў Расіі

**Прадпрыемствы сістэмы Міністэрства прамысловасці Беларусі прымуць удзел у Міжнародным форуме-выстаўцы «Расійскі прамысловец — 2025», які пройдзе з 29 па 31 кастрычніка 2025 года ў Санкт-Пецярбургу ў КВЦ «Экспафорум», расказалі ў ведамстве.**



Тут адзначылі, што наша краіна — шматгадовы партнёр форуму-выстаўкі. Сёлета на гэтым значным мерапрыемстве прадпрыемствы Мінпрама прадставяць шырокі спектр сваёй прадукцыі, прадэманстраваўшы дасягненні ў галіне прамысловай вытворчасці і інавацыйных тэхналогій.

Калектыўная экспазіцыя арганізацый Міністэрства прамысловасці складзе амаль 140 «квадратаў», дзе сваю прадукцыю прадставяць 17 арганізацый: акцыянерныя таварыствы БЕЛАЗ, Магілёўліфтмаш, Зеніт (г. Магілёў), Інтэграл, Станкабудаўнічы завод імя Кірава, Вістан, МЗОР, БАТЭ і іншыя.

У ходзе выстаўкі будуць прадстаўлены ўзоры прадукцыі, якая выпускаецца ў галіне станкабудавання, аўтамабілебудавання і прыборабудавання, інавацыйных распрацовак, новай інавацыйнай, імпартазамяшчальнай і экспартаарыентаванай прадукцыі. Прадстаўнікі прадпрыемстваў галіны правядуць перагаворы з зацікаўленымі ў супрацоўніцтве партнёрамі з мэтай устанаўлення новых дзелавых сувязяў і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, а таксама азнаёмяцца з найноўшымі дасягненнямі ў галіне навукі і тэхнікі, новымі відамі прадукцыі і тэхналогіямі вытворчасці.

— Форум-выстаўка «Расійскі прамысловец — 2025» з'яўляецца адной з ключавых платформ для абмеркавання актуальных пытанняў развіцця прамысловасці, абмену вопытам і ўстанаўлення дзелавых кантактаў, — адзначылі ў Мінпраме. — Удзел беларускіх прадпрыемстваў у гэтай падзеі падкрэслівае імкненне краіны да далейшага развіцця, умацавання супрацоўніцтва з расійскімі партнёрамі і пашырэння экспартных магчымасцяў.

У ведамстве дадалі, што ўдзел у форуме стане важным крокам для прадпрыемстваў галіны, які дасць магчымасць не толькі прадэманстраваць высокую якасць беларускай прадукцыі, але і наладзіць новыя дзелавыя сувязі, якія будуць спрыяць развіццю эканомік абедзвюх краін.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Открытое акционерное общество**

**«Дорожно-строительный трест № 3»**

**14 ноября 2025 года в 11.30**

проводит повторный открытый аукцион по продаже имуществ

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 60 % без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Автомобиль RENAULT LATITUDE, легковой седан (SEDAN), 2013 года выпуска, кузов (рама) № X7LAB421A48270742, регистрационный 8228 ВХ-6, цвет – черный, инвентарный номер 906 | 8880,00 | 888,00 |
| Лот № 2 | Автомобиль VOLKSWAGEN AMAROK, грузовой пикап (PICK UP), 2015 года выпуска, кузов (рама) № WV1ZZZ2HZFA052250, регистрационный знак AI 1389-6, цвет – черный, инвентарный номер 854 | 17920,00 | 1792,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **14 ноября 2025 года в 11.30** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утверждённое приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **10.11.2025 г., время: 17.00.**

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

9. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 17.09.2025 и на сайте ОАО «ДСТ № 3»



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| Предметы торгов | Начальная цена, бел. руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** - комбайн РСМ-142 «ACROC» 530, год выпуска 2009 г., регистрационный знак АВ-1 9015; - приспособление для уборки рапса ПЗР-7-01, год выпуска 2009 г.; - тележка транспортная для транспортировки жатки РСМ-142.2, год выпуска 2009 г. | 43 920,00 | 4 392,00 |
| **Лот № 2:** - комбайн зерноуборочный самоходный КЗС-1218-10, год выпуска 2010 г., регистрационный знак АВ-1 9008; - жатка зерновая ЖСК-7-2 с транспортной тележкой, год выпуска 2010 г. | 43 680,00 | 4 368,00 |

**Продавец:** ОАО «Ивацевичиагротехсервис», 225295, Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3, тел./факс 80164592143. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** до 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** 50 % стоимости Объекта уплачивается в течение 10 (десяти) банковских дней с даты заключения договора купли-продажи Объекта; 50 % стоимости Объекта уплачивается в рассрочку равными частями в течение 3 (трех) месяцев без индексации платежей. Возможно досрочное погашение стоимости Объекта. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 02 декабря 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 09.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 01 декабря 2025 г. до 17.00**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «АзотСпецТранс», 230013, г. Гродно, пр. Космонавтов, 100 |

**Предмет электронных торгов:** транспортные средства и спецтехника (бывшие в употреблении), расположенные по адресу: г. Гродно, пр. Космонавтов, 100

| Лот, № | Инв. номер | Наименование | Год выпуска | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **1** | 3000172 | Полуприцеп специальный самосвал OZGUL TRAILER G, р/зн. А 5782 В-4, | 2017 | **36 550,00** |
| **2** | 174864 | Грузовой седельный тягач MAZ 5440 19-1421-031, р/зн. АВ 8857-4 | 2010 | **50 100,00** |
| **3** | 174865 | Грузовой седельный тягач MAZ 5440 19-1421-031, р/зн. АВ 8856-4 | 2010 | **52 176,00** |
| **4** | 173870 | Грузовой фургон тентовый MAZ 5336 А5, р/зн. АЕ 8381-4 | 2008 | **11 873,00** |
| **5** | 11593 | Грузовой специальный автокран IN.PROIZV KRUPP KMK 6140, р/зн. AI 8536-4 | 1989 | **144 000,00** |
| **6** | 174760 | Грузовой специальный самосвал GAZ-SAZ-3507, р/зн. АВ 6480-4 | 2010 | **17 076,00** |
| **7** | 174110 | Грузовой специальный мусоровоз MAZ 5902А2, р/зн АА 9746-4 | 2009 | **10 074,00** |

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.11.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.11.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор купли-продажи для подписания победителю аукциона

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов.
Подробная информация по размеру затрат и вознаграждения опубликована на www.ipmtorgi.by в карточке предмета электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 20.09.2025

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44)-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



**Брестский филиал РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего**
**РУП «Брестское отделение Бел.ж.д.»**

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Срок договора аренды |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1:** право заключения договора аренды недвижимого имущества: склад с инв. № ЕГРНИ 100/С-46612 площадью 267,2 кв. м и рампа площадью 384,0 кв. м по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Октябрьская, 14/2 | 1 222,30 | 3 года |

**Организатор аукциона:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел.: 80162 40 87 01, 40 87 41

**Аукцион состоится 19 ноября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-41, 40-87-01**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, а также на сайте организатора аукциона ocenkabrest.by


# АДВЕСЦІ АД УДАРУ

## ПАСПЕЦЬ У «ЗАЛАТЫЯ» ГАДЗІНЫ

Штогод у Беларусі з вострымі парушэннямі мазгавога кровазвароту ў стацыянары паступае каля 41 тысячы чалавек. Каля 85 % інсультаў — ішэмічныя (пры іх тромб ці эмбал перакрывае прасвет цэрэбральнай артэрыі), і толькі каля 15 % — гемарагічныя (калі адбываецца разрыў сасуда і кроў трапляе ў рэчыва галаўнога мозгу ці пад яго абалонкі, адпаведна наступствы куды больш цяжкія).

— Такія суадносіны — пэўнае дасягненне нашай сістэмы аховы здароўя. Дзякуючы таму што праводзяцца дыспансерызацыі, людзі ведаюць пра свае хранічныя хваробы, імкнуцца змагацца з імі і кантралююць, гемарагічных інсультаў у нас усяго 15 %. Напрыклад, у краінах Цэнтральнай Азіі гемарагічных інсультаў больш за палову, — адзначае **загадчык аддзела неўралогіі і нейрахірургіі МНПЦ хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі, галоўны пазаштатны ангіянеўролаг Міністэрства аховы здароўя Сяргей МАРЧАНКА.**

Для пацыентаў з інсультам неўралагічныя аддзяленні функцыянуюць у стацыянарах розных гарадоў. У Мінску, напрыклад, такіх бальніц усяго тры. У цэлым жа з 35 бальніц у краіне 24 аснашчаны ангіёграфамі. У іх маецца больш за 2 тысячы ложкаў для інсультных пацыентаў, з іх звыш 160 — рэанімацыйныя. Гэтай колькасці цалкам дастаткова.

**Дапамога пацыентам з інсультам аказваецца паэтапна. Пры з'яўленні першых сімптомаў (сярод самых распаўсюджаных — перакошаны твар, слабасць у руцэ і парушэнне маўлення) варта неадкладна выклікаць хуткую дапамогу. Аператар «103» высвятляе сімптомы і накіроўвае брыгаду медыкаў. На сёння ў краіне своечасова па медыцынскую дапамогу — у так званыя «залатыя» 4,5 гадзіны ад пачатку сімптомаў — звяртаецца ўсяго 25—30 % пацыентаў. З дапамогай праграмы сацыяльнай рэкламы, якую мяркуецца запусціць, медыкі спадзяюцца палепшыць сітуацыю з раннімі зваротамі, што дасць эфект і ў лячэнні.**

## «ЗЯЛЁНЫ» КАЛІДОР

Пры своечасовым звароце, калі пацыент знаходзіцца ў тэрапеўтычным акне, для яго арганізуюць так званы «зялёны» калідор, які дазваляе не губляць ні хвіліны каштоўнага часу ні на адным з этапаў. Яшчэ падчас транспарціроўкі медыкі тэлефануюць у стацыянар, дзе загадзя рыхтуюцца аказваць дапамогу. У прыёмным аддзяленні не толькі робяць неабходныя аналізы, але і вырашаюць пытанне правядзення рэперфузійнай тэрапіі. Адзін з яе варыянтаў — механічная тромбэктамія, калі з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў праз невялікі доступ у цэрэбральную артэрыю тромб выдаляюць. Але гэта методыка магчымая толькі на вялікіх магістральных артэрыях. Яшчэ больш шырока прымяняецца трамбалізіс, ён магчымы на сасудах любога дыяметра.









Праўда, трамбалізіс вымагае зладжаных і хуткіх дзеянняў. У МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі больш чым палова пацыентаў атрымлівае яго на працягу першай гадзіны, 30 % — на працягу 45 хвілін.

— Чым хутчэй спрацуем, тым лепшыя вынікі, — кажа Сяргей Марчанка. — Пры своечасовым трамбалізісе 75—80 % пацыентаў на момант выпіскі са стацыянара сімптомаў інваліднасці не маюць ці выходзяць з мінімальнымі парушэннямі, якія не ўплываюць на іх паўсядзённае жыццё.

## РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ РЭГІЁНАЎ

У апошнія гады рэперфузійная тэрапія перажывае бурны рост. У 2024 годзе ў краіне яе атрымалі амаль 4 тысячы пацыентаў, а сёлета за 9 месяцаў — ужо 3,7 тысячы. Сёлета істотна павялічылася колькасць тромбэктамій: за 9 месяцаў іх выканана больш, чым за ўвесь 2024 год. У МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі каля 30 % пацыентаў з ішэмічным інсультам атрымліваюць трамбалізіс або тромбэкстракцыю, па краіне гэта лічба складае 15 %. Аднак рэгіёны паступова падцягваюцца: напрыклад, Віцебская вобласць па гэтым паказчыку ў хуткім часе дагоніць Мінск. Гэта стала магчымым у тым ліку дзякуючы падрыхтоўцы спецыялістаў. Больш як 300 неўролагаў прайшлі адпаведнае навучанне методыкам рэперфузійнай тэрапіі на базе МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі за апошнія тры гады.

Яшчэ адна навацыя цэнтра — першы ў краіне інсультны блок, адкрыты два гады таму. Гэта аддзяленне кароткатэрміновага знаходжання, дзе пацыенты, якія не маюць патрэбы ў рэанімацыі, знаходзяцца ад 24 гадзін да 3-4 сутак пад назіраннем медперсаналу.

— Дзякуючы актыўнаму назіранню і своечасоваму рэагаванню на розныя праблемы нам сур'ёзна ўдалося знізіць лятальнасць і пашырыць прымяненне рэперфузійнай тэрапіі, — адзначае **намеснік дырэктара па лячэбнай рабоце МНПЦ хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі Вадзім МАЦЮШКО**, дадаючы, што распаўсюдзіць вопыт такіх аддзяленняў плануецца на ўсю краіну.

Паводле аналізу медыкаў, інсульт не маладзее. За 11 апошніх гадоў колькасць гэтых захворванняў у людзей ад 18 да 44 гадоў нязменна складае ўсяго каля 3,7 %. А вось «унёсак» пацыентаў ва ўзросце 75+ — 37 %. Пры гэтым уплывае не толькі і не столькі ўзрост, колькі лад жыцця. Фактары рызыкі інсульту даўно вядомыя: артэрыяльны ціск (больш за 95 % пацыентаў з інсультам пакутуюць ад высокага ціску), халестэрын, лішняя вага, арытмія, цукровы дыябет, курэнне, злоўжыванне алкаголем, начныя апноэ і малярухомы лад жыцця.

**Алена КРАВЕЦ. Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ПАЕХАЛІ!

# ТЭХНІКА З ПЕРСПЕКТЫВАЙ

## Як развіваецца айчынная аўтамабільная прамысловасць

Як адзначыў галоўны тэхнолаг ААТ «МАЗ» — кіруючая кампанія холдынгу «БЕЛАЎТАМАЗ» Сяргей СЛАЎНІКАЎ, маштабная прагама тэхналагічнай трансфармацыі вытворчасці разлічана да 2035 года. Яе галоўная мэта — стварэнне канкурэнтаздольнай тэхнікі. Акрамя таго, укараняюцца перадавыя, у тым ліку рабатызаваныя тэхналогіі.

## ПЕРШЫ ЭЛЕКТРЫЧНЫ СМЕЦЦЯВОЗ

Тры тысячы аўтобусаў у год — менавіта на такую магутнасць выйшла прадпрыемства пасля рэканструкцыі аўтобуснага завода. Развіваюцца сумежныя вытворчасці. Так, на заводзе «Магілёўтрансмаш» укараненне рабатызаванай зваркі дало магчымасць не толькі гарантаваць высокую якасць зварных швоў, але і павысіць прадукцыйнасць, хуткасць работ і бяспеку. Абнаўляецца вытворчасць пярэдніх восяў, праводзіцца мадэрнізацыя ліцейнага, кавальскага, тэрмагальванічных заводаў.

Пашыраецца наменклатура прадукцыі. Днямі МАЗ перадаў першы беларускі электрычны смеццявоз МАЗ-GT камунальным службам. «Гэта машына з запасам ходу 200 кіламетраў і нулявым узроўнем выкідаў. Яна ўжо праходзіць выпрабаванні ў рэальных гарадскіх умовах. Праект наглядна дэманструе нашы магчымасці па стварэнні высокатэхналагічнай і экалагічнай спецтэхнікі», — расказаў Сяргей Слаўнікаў.

Яшчэ адзін напрамак — больш глыбокая лакалізацыя вытворчасці мікрааўтобусаў на ААТ»Брэстмаш». «Над гэтым пытаннем працуем. Некаторыя пазіцыі закупляем, некаторыя вырабляем. Тут важна выканаць такі параметр, як кошт — якасць», — дадаў Сяргей Слаўнікаў.

Вядзецца масавы выпуск запатрабаванай спажыўцамі дызельнай тэхнікі. У холдынгу бачаць вялікія перспектывы ў такім кірунку, як выпуск тэхнікі, якая працуе на электрычнасці і на газе. Створана лінейка электробусаў і аўтамабіляў на газавым прывадзе.






## ЗВАРКА — ВЫКЛЮЧНА РОБАТАМІ

Як паведаміў **галоўны тэхнолаг «БелДжы» Сяргей ТРАДЧЫК**, на аўтамабільным заводзе праведзена маштабная мадэрнізацыя. На вытворчасці ўкаранёна 48 робататэхнічных комплексаў. Абнаўленні закранулі перш за ўсё цэхі зваркі і афарбоўкі кузаваў. Устаноўлена дадатковае абсталяванне, павялічана доля аўтаматызацыі. «Асаблівым выклікам для нас стаў мінулы год, калі рынак патрабаваў вялікай колькасці аўтамабіляў. Нам прыйшлося хутка нарошчваць вытворчыя магутнасці. Прайшла маштабная мадэрнізацыя», — адзначыў Сяргей Традчык. Усяго летась выраблена больш за 91 тысячу аўтамабіляў. «Сёлета плануем перасягнуць гэтую мяжу. На будучы год таксама планы сур'ёзныя», — дадаў прадстаўнік прадпрыемства.

Перспектыўны напрамак — вытворчасць электрамабіляў. «БелДжы» ўжо прадставіў дзве мадэлі — Geely EX5, Geely EX2, а таксама гібрыд BELGEE X80. «Першапачаткова наш завод арыентаваўся на знешнія рынкі. Большасць прадукцыі — каля 80 % — экспартуецца ў Расію. Таксама прапрацоўваюцца іншыя краіны», — расказаў Сяргей Традчык. Яшчэ адзін кірунак працы — лакалізацыя, у прыватнасці, вытворчасць рухавікоў і каробак передач.

## ПАЛОВА — НА ЭКСПАРТ

«Белшына» каля паловы сваёй прадукцыі пастаўляе на экспарт, паведаміла **начальнік бюро маркетынгавых даследаванняў і стратэгічнага маркетынгу прадпрыемства Ганна БАСАРЭЎСКАЯ**. Асноўнымі стратэгічнымі пляцоўкамі з'яўляюцца ўнутраны рынак і рынак Расіі. Таксама пастаўкі ажыццяўляюцца ў Казахстан, Кыргызстан, Азербайджан, Туркменістан, Таджыкістан, Бангладэш, Венесуэлу і іншыя краіны.

**Начальнік інжынерна-тэхнічнага цэнтра «Белшыны» Сяргей КАЮШНІКАЎ** адзначыў, што ў пашырэнне асартыменту прадукцыі ўкладваюцца значныя сродкі. Адна з апошніх навінак для вытворцаў сельгастэхнікі — шыны для эксплуатацыі на паніжаным ціску, што забяспечвае зніжэнне нагрузкі на глебу. Распрацоўваюцца шыны для аўтамабіляў «БелДжы». Завяршаюцца выпрабаванні шын, прызначаных для электрамабіляў.




**Сяргей КУРКАЧ.**
**Фота БелТА.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидский завод электроизделий», Гродненская область, г. Лида, ул. Фабричная, д. 4. УНП 500021270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов:** бывшее в употреблении имущество. Местоположение – г. Лида, ул. Фабричная, д. 4

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Полуприцеп бортовой MAZ 975800 2010, А 7078 Е-4, 2008 г. в.** | **4 434,60** |
| 2 | **GAZ 33104 1, 2011 г. в.** (снят с учета в связи со списанием (утилизацией)) | **6 650,00** |

Цена снижена на 5 %.
Шаг электронных торгов: 5 % от текущей цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **10 (десяти)** рабочих дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение по лоту № 1 – 10 % и по лоту № 2 – 8 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.09.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 11.11.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 10.11.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**



**Могилевский филиал РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор торгов)**
**информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего**
**РУП «Завод газетной бумаги» (Продавец)**
**на праве хозяйственного ведения**

**Электронные торги состоятся 19.11.2025 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**Лот № 1. Грузовой автомобиль GAZ 33027 3,**
тип кузова – бортовой тентовый, р/з АВ 0704-6,
кузов (рама) 33023070064854, X9633027372180477, г. в. – 2006.
***Начальная цена продажи: 4 440,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 444,00 бел. руб.***

**Лот № 2. Автобус MAZ 152062,**
тип кузова – вагон, кузов (рама) №Y3M15206290000530,
р/з – АВ 0439-6, г. в. – 2009.
***Начальная цена продажи: 46 140,54 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 4 614,05 бел. руб.***

Местонахождение объектов: г. Шклов, ул. 1-я Заводская, 9.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, Могилевского облисполкома, на сайте au.nca.by и на торговой площадке GOSTORG.BY.

Организатор торгов и оператор ЭТП:
Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

**Доп. информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, на сайте ЭТП www.gostorg.by**



**ОАО «ЦентроСтройОфис»**
*(г. Минск, ул. Монтажников, 39-208)*
проводит внеочередное общее собрание акционеров ОАО «ЦентроСтройОфис» в очной форме
**18 ноября 2025 года в 11.00.**

Место проведения собрания:
ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

**Повестка дня собрания**
1. Об избрании членов Наблюдательного совета Общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45 по адресу: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

Участники собрания должны иметь при себе документ, удостоверяющий личность (представители акционера – документ, удостоверяющий личность и доверенность).

Дата составления списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания по состоянию реестра акционеров на 10.11.2025 г.

Время и место ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании, с материалами по вопросам повестки дня общего собрания: с 10.00 до 11.00, в рабочие дни с 10.11.2025 г. по 17.11.2025 г. по адресу: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

УНП 191303207

# ЛЁГКІЯ ГРОШЫ — ЦЯЖКІЯ НАСТУПСТВЫ

**Як падлеткі становяцца пешкамі інтэрнэт-махляроў і нарказлачынцаў**

У параўнанні з мінулым годам дзіцячая злачыннасць знізілася на 26 працэнтаў. За апошнія 20 гадоў дынаміка зніжэння яшчэ больш істотная — у разы (з 9 тысяч злачынстваў у 2005-м да 800 злачынстваў сёлета). Іншымі сёння сталі і самі злачынствы: сярод самых распаўсюджаных — крадзяжы, хуліганствы і незаконны абарот наркотыкаў. Крадуць дзеці ў асноўным грошы, тэлефоны і веласіпеды. Хуліганства звязана ў першую чаргу з пашкоджаннем маёмасці — агароджаў, вокнаў, ліхтарных слупоў, а незаконны абарот наркотыкаў — са збытам псіхатропных рэчываў.



## ХУТКІЯ ЗАРОБКІ — ДОЎГІЯ ТЭРМІНЫ

Ісці на злачынствы падлеткаў прымушае жаданне зарабіць лёгкія грошы. Як патлумачыў **намеснік начальніка аддзела па арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Васіль ДЗЕМІДОВІЧ,** практычна кожны тыдзень фіксуюцца затрыманні дзяцей за збыт наркотыкаў. Не выключэнне і гэты тыдзень: з 500 грамамі альфа-PVP затрыманы непаўналетні, навучэнец першага курса юрыдычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Галоўная прычына, па якой ён гэта рабіў, — хацеў зарабіць. Але не атрымалася: хлопец «адпрацаваў» усяго два тыдні. Першы раз «заказчыкі» яго правяралі — замест наркотыкаў ён раскладваў цукар. Потым узяў «майстар-скарб» — вялікую дозу наркотыкаў, якую павінен быў расфасаваць. Супрацоўнікі міліцыі яго адразу ж затрымалі. Цяпер хлопцу пагражае працяглы тэрмін.

Падлеткі сталі больш учыняць рабаванняў і разбояў, дзе прадметам злачыннага замаху з'яўляюцца электронныя сістэмы курэння. Пад падставай пакупкі вейпа яны сустракаюцца з прадаўцом — як правіла, гэта такія ж непаўналетнія — і адбіраюць у яго электронныя прылады. Акрамя таго, актыўна запаўняецца непаўналетнімі і ніша кіберзлачынстваў. Іх мэта — завалодаць персанальнымі данымі або рэквізітамі банкаўскіх картак, каб у далейшым атрымліваць грошы або дывідэнды. Адным са спосабаў з'яўляецца стварэнне фішынгавых сайтаў. Спасылка на іх рассылаецца ў разнастайныя групы. У некаторых выпадках выявы ствараюцца з дапамогай нейрасетак. Карыстальніку прапануецца прагаласаваць, напрыклад, за ўпадабаны малюнак ці дзяўчыну на конкурсе прыгажосці, клікнуўшы на кнопку для галасавання.

Нярэдка непаўналетнія ствараюць старонкі ў сацыяльных сетках і на гандлёвых пляцоўках, размяшчаючы там фота якога-небудзь тавара па заніжанай цане. У асноўным гэта такі запатрабаваны тавар у дзяцей, як красоўкі, спартыўнае адзенне, сумачкі. Калі тыя ж дзеці заходзяць на сайт, то, адпаведна, ніякай маёмасці яны не атрымліваюць, іх проста ашукваюць.

## СВАТЫНГ ЯК СПОСАБ ПОМСТЫ

Сёлета за 9 месяцаў у краіне вырасла колькасць заведама фальшывых паведамленняў аб небяспецы ад імя іншых непаўналетніх (так званы сватынг) — з 6 да 23 злачынстваў. Як расказаў **старшы пракурор па асобых даручэннях упраўлення Генеральнай пракуратуры па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб непаўналетніх і моладзі Раман СІДАРЭНКА,** часта падлеткі знаходзяць у сацыяльных сетках і месенджарах тэматычныя групы і чаты, удзельнікі якіх прапануюць бясплатна паведаміць загадзя лжывую інфармацыю, напрыклад аб мініраванні сацыяльных або гандлёвых аб'ектаў ад імя той асобы, на якую пакажуць непаўналетнія. Уладальнікі такіх груп або чатаў, як правіла, знаходзяцца за мяжой. Шляхам рассылання электронных лістоў на афіцыйныя паштовыя скрыні або накіравання паведамленняў у месенджары паведамляюць ілжывую інфармацыю. Пры гэтым сам падлетак часта наіўна мяркуе, што ён не здзяйсняе ніякага злачынства, бо непасрэдна загадзя лжывую інфармацыю аб небяспецы не паведамляе. Але ў гэтым выпадку яго дзеянні кваліфікуюцца як падбухторванне да здзяйснення злачынства, і ён нясе крымінальную адказнасць нараўне з выканаўцам.

Раман Сідарэнка прывёў у прыклад сітуацыю з жыхаром Магілёва. Жадаючы з помсты за перапыненыя адносіны са сваёй дзяўчынай заблакіраваць яе акаўнт у Telegram, ён стаў шукаць у інтэрнэце адпаведную інфармацыю. У сетцы TikTok яму трапіўся навучальны відэаролік патрэбнага зместу. Адкрыўшы каментарый да відэа ў профілі, ён перайшоў па спасылцы ў месенджар Discord і пазнаёміўся з іншым карыстальнікам, якога папрасіў навучыць яго ўзлому акаўнтаў. Яму было прапанавана адключыць антывірусную абарону і спампаваць па спасылцы некалькі дадаткаў, што ён і зрабіў.

Аднак пасля іх устаноўкі падлетку было прадэманстравана, што яго ўстройства ўзламана і трэція асобы атрымалі доступ да ўсяго змесціва, у тым ліку да яго акаўнтаў у сацыяльных сетках. Яму прапанавалі або выкупіць назад свае даныя, або паведаміць аб ілжывай небяспецы ад імя іншага чалавека. Малады чалавек прад'явіў даныя былой дзяўчыны, нумар мабільнага тэлефона, электронны адрас школы і месца яе размяшчэння для паведамлення ад яе імя аб нібыта мініраванні ўстановы адукацыі. У выніку школа была лжыва замініравана ад імя дзяўчыны, у адносінах да падлетка ўзбуджана крымінальная справа і накіравана ў суд.

Раман Сідарэнка адзначыў, што пачашчэнне такіх выпадкаў сведчыць аб неабходнасці ўдасканалення органамі ўнутраных спраў і ўстановамі адукацыі сваіх падыходаў давядзення да моладзі рызык трапіць у непрыемную сітуацыю і адказнасці за неабдуманыя ўчынкі.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА на право аренды земельных участков в г. Жодино

| Месторасположение земельного участка и кадастровый номер | Земельный участок, расположенный по ул. Труда, 2Г в г. Жодино, 641300000004001537 | Земельный участок, расположенный по ул. Дорожной, 9Г в г. Жодино, 641300000004001538 | Земельный участок, расположенный по ул. Труда, 9 в г. Жодино, 641300000004001240 |
|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 |
| Целевое назначение | Для строительства и обслуживания складских зданий (код по классификатору 1 16 00 – земельный участок для размещения объектов иного назначения); срок аренды **20 лет** | Для строительства и обслуживания складских зданий (код по классификатору 1 16 00 – земельный участок для размещения объектов иного назначения); срок аренды **20 лет** | Для строительства и обслуживания торгового центра (код по классификатору 1 16 03 – земельный участок для размещения объектов розничной торговли); срок аренды **20 лет** |
| Площадь | **0,4570 га** | **0,7124** | **1,5360 га** |
| Условия предоставления земельного участка, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | - без изменения целевого назначения;<br>- обеспечить вынос канализационной сети из-под пятна застройки и переключение всех присоединенных трубопроводов;<br>- организация подъездов и подходов в твердых покрытиях;<br>- благоустройство прилегающей территории и строительство внеплощадочных инженерных сетей к объекту согласно проектной документации;<br>- снос существующих дикорастущих деревьев и кустарников | - без изменения целевого назначения;<br>- организация подъездов и подходов в твердых покрытиях;<br>- благоустройство прилегающей территории и строительство внеплощадочных инженерных сетей к объекту согласно проектной документации;<br>- снос существующих дикорастущих деревьев и кустарников;<br>По территории земельного участка проходят 2 городских магистральных канализационных коллектора О600мм. При строительстве зданий и сооружений техническими условиями будет установлено минимальное технологическое расстояние – 10 м по обе стороны трубопроводов до фундаментов зданий, сооружений и ограждений. При эксплуатации зданий и сооружений на землепользователя будут наложены следующие обременения:<br>- обеспечивать беспрепятственный круглосуточный доступ к канализационным сетям работникам КУП «Жодинский водоканал»;<br>- не предъявлять имущественных претензий к КУП «Жодинский водоканал» в случае аварии на канализационных сетях;<br>- производить своими силами и за свой счет восстановление благоустройства территории после аварийно-восстановительных работ на канализационных сетях | - без изменения целевого назначения;<br>- при необходимости вынос сетей из пятна застройки;<br>- организация подъездов и подходов в твердых покрытиях;<br>- благоустройство прилегающей территории и строительство внеплощадочных инженерных сетей к объекту согласно проектной документации |
| Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории | Возможность подключения к инженерным сетям: водоснабжение, газоснабжение, электроснабжение, сети электросвязи | Возможность подключения к инженерным сетям: водоснабжение, газоснабжение, электроснабжение, сети электросвязи | Возможность подключения к инженерным сетям: водоснабжение, газоснабжение, канализация, ливневая канализация, тепловые сети, электроснабжение |
| Ограничения в использовании | Площадью 0,0066 га – охранная зона электрической сети, площадью 0,0540 га – охранная зона объектов газораспределительной системы | Площадью 0,0020 га – охранная зона электрической сети | Площадью 1,5360 га – природные территории, подлежащие специальной охране (водоохранная зона вдхр. Жодинское);<br>площадью 0,0685 га – охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации;<br>площадью 0,3928 га – охранная зона электрической сети;<br>площадью 0,1716 га – охранная зона объектов газораспределительной системы |
| Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | **10 202,53** | **9 268,32** | **49 751,04** |
| Затраты | **5 934,71 + затраты на публикацию в СМИ** | **6 044,88 + затраты на публикацию в СМИ** | **8 682,66 + затраты на публикацию в СМИ** |
| Сумма задатка, бел. руб. | **1 020,25** | **926,83** | **4 975,10** |
| Дата проведения аукциона | **27.11.2025** | **27.11.2025** | **27.11.2025** |
| Последний день приема заявлений | **21.11.2025** | **21.11.2025** | **21.11.2025** |
| Время проведения аукциона | **14.30** | **14.40** | **14.50** |

Подробная информация об объявленном аукционе размещена на официальных сайтах Минского облисполкома https://minsk-region.gov.by, Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by и Жодинского горисполкома https://zhodino.gov.by. **Контактные телефоны для справок в г. Жодино: 80177549093, 80177548574**

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
29 кастрычніка 2025 г. № 40 (821)




# ДЗЕЛЯ ПАМЯЦІ І САМАПАВАГІ

## Як на месцах добраўпарадкоўваюць месцы пахавання

Кажуць, аб стане грамадства, аб яго маральным здароўі можна меркаваць па стане могілак. Беларусы, чые продкі спрадвеку ляжаць менавіта ў гэтай зямлі, заўжды з павагай ставяцца да родных магіл. Напярэдадні дзён памяці, якія сёлета супалі ў праваслаўных і каталікоў (1 лістапада і Дзмітрыеўская бацькоўская субота, і дзень Усіх Святых) нашы карэспандэнты ў рэгіёнах высветлілі, як наводзіцца парадак на месцах вечнага спачыну.

### ТАЛАКА ПА-ХАЛАМЕРСКУ

Вёска Халамер'е знаходзіцца на самым ускрайку Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці, але прагрэсіўны вопыт яе жыхароў варты пераймання.

З год таму на агульным сходзе яны звярнулі ўвагу на непрывабны стан мясцовых могілак — месца, дзе спачываюць халамерцы і жыхары суседніх вёсак Маісеева і Мішуціна. Хто ж навядзе тут парадак, калі не мы? Такім пытаннем задаліся энтузіясты з сельскай глыбінкі — і вырашылі дзейнічаць.

Для добраўпарадкавання патрэбны найперш арганізатары, тады — грошы. Актывісткі Святлана Ваявода і Ніна Склімянок вызваліся іх збіраць. Сродкаў, сабраных за кошт самаабкладання, па 20 рублёў са двара, неставала. Ніна ўзялася турбаваць ураджэнцаў халамерскага краю, якіх лёс раскідаў па свеце, аднак жа іх бацькі і родныя знайшлі апошні прытулак на халамерскіх могілках.

— Шукала людзей праз сацыяльныя сеткі, даведвалася адрасы і нумары тэлефонаў праз магчымых знаёмых. Шукала ва ўсіх абласцях Беларусі, у Расіі і Малдове, Украіне і Ізраілі, — успамінае **Ніна Склімянок**. — Тлумачыла, што мы задумалі, прасіла дапамогі. Ведаеце, многія расчульваліся, бо па розных прычынах не маюць магчымасці наведваць родныя магілы: замінаюць адлегласць, граніцы, узрост, стан здароўя. Але справу лічылі патрэбнай і высакароднай, адгукаліся адразу. Перадавалі ў агульную скарбонку хто колькі мог.

Сход вырашыў, што найперш трэба пабудаваць агароджу з франтальнага боку. Першую закупку металічных пралётаў агароджы, слупоў, камплектуючых частак зрабілі ўзімку. Няўрымслівая Ніна шукала, дзе танней, аб'ехала ўсе даступныя гандлёвыя крамы, хацелася па-гаспадарску расходаваць народныя грошы. Слупы купілі нефарбаваныя і загадзя фарбавалі самастойна.

Але здарылася нечаканае і прыемнае: пачало працаваць сарафаннае радыё. Ахвяраванні перадалі каля 200 чалавек. Такім чынам да наступлення цяпла ўдалося набыць агароджу яшчэ на два бакі могілак.

— Мы выйшлі на першы суботнік, — згадвае Ніна Склімянок. — Рупліва працавалі цэлы дзень: жанчыны выграбалі траву, высякалі хмызнякі, мужчыны, прыцягнуўшы з уласных падворкаў неабходныя прылады — бетонамяшалку, бензабур і іншае — устанаўлівалі слупы, замацоўвалі на іх агароджу.



Прыкмеціла і ацаніла пачын халамерскай талакі старшыня Гарадоцкага райвыканкама Ірына Палякова, дапамагала з арганізацыяй падвозу гравію, грэйдзіраваннем дарогі. Старшыня райсавета Святлана Зуева падключыла інфармацыйныя рэсурсы, каб звесткі аб змяненнях, ініцыяваных жыхарамі, сталі вядомыя шырокай аўдыторыі. Гарадоцкае прадпрыемства кацельных і цеплавых сетак устанавіла каля могілак кантэйнерныя пляцоўкі для збору смецця і раслінных адходаў. Усім светам, як кажуць.

— Калі на Тройцу на могілкі па традыцыі з'ехаліся людзі, як яны нам усім дзякавалі, плакалі! — расказвае Ніна Склімянок. — Могілкі пасвятлелі, пачысцелі. Мы ж навялі парадак і на тых магілках, чые родныя дапамаглі грашыма, але не могуць прыехаць асабіста. Нават рабілі фотасправаздачы.

На сёння халамерскія могілкі маюць акуратную металічную агароджу даўжынёй 200 метраў з трох бакоў. Яе ўсталяванне абышлося ў крыху больш як 5 тысяч рублёў, без уліку кошту вытворчасці работ — іх местачкоўцы выконвалі бясплатна. Ёсць упэўненасць, што згуртаваныя працавітыя халамерцы справяцца і з апошнім, чацвёртым бокам. Ім па сілах. А вам?

### СТАЛА МЕНШ БЕЗЫМЕННЫХ КРЫЖОЎ

У Семукацкім сельсавеце Магілёўскага раёна могілкі даўно ўжо знаходзяцца на балансе мясцовага «Жылкамгаса». Але дэпутатам таксама тут работы хапае. Калі трэба абкасіць тэрыторыю або паставіць агароджу, яны каапяруюцца і едуць працаваць разам. Насельніцтва таксама падключаецца. У выніку работа атрымліваецца больш рэзультатыўная.

Сёлета ў Семукацкім сельсавеце замянілі агароджу на сельскіх могілках у вёсцы Алень і адрамантавалі ў Гарадзішчы.

— Матэрыял быў закуплены і прывезены «Жылкамгасам», усё астатняе рабілі сельсаветам разам з арганізацыямі і насельніцтвам, — расказвае **старшыня Семукацкага сельсавета Тамара УКРУЖСКАЯ**. — Устанавілі і пафарбавалі агароджу, добраўпарадкавалі тэрыторыю. Пра астатнія могілкі таксама не забываем. Адсочваем, каб смецце не назапашвалася ў спецыяльна адведзеных для яго складзіравання месцах. Прычым увесь час, а не толькі перад Вялікаднем ці іншымі памінальнымі датамі.

Усяго на тэрыторыі сельсавета 12 грамадзянскіх могілак, усе яны знаходзяцца на значнай адлегласці. Не рэдкасць, калі старшыня сельсавета асабіста падвозіць рабочых ад «Жылкамгаса» на найбольш аддаленыя з іх. На адзін вынік працуем, разважае Тамара Укружская.

На думку суразмоўніцы, апошнім часам парадку на сельскіх могілках стала больш дзякуючы інвентарызацыі.

— Кожнае новае пахаванне рэгіструецца ў сельвыканкаме, — адзначае яна. — На ўсіх могілках вісяць аб'явы, што хаваць без дазволу нельга. Нават, калі нехта прывёз з горада і самавольна пахаваў сваяка, потым прыходзіць да нас. Просіць прабачэння, што спачатку не ведаў, а потым людзі падказалі, куды трэба падысці. Але часцей усё ж такі загадзя папярэджваюць. Цяпер з гэтым вельмі строга.

Сёлета работы па добраўпарадкаванні месцаў смутку завершаныя. Налета плануецца замена агароджы яшчэ на адных могілках у вёсцы Алень. «Жылкамгас» адзін ніколі не застаецца. Ён рэальна ўсё не зможа ахапіць. Асабліва, калі нешта трэба зрабіць акрамя прыборкі. Тую ж траву абкошваем разам. Могілкі ў нас вялікія. Парадак з аварыйнымі дрэвамі навялі яшчэ некалькі гадоў таму. Усе выдалілі.

Адказнасць жыхароў — даглядаць выключна свае пахаванні. І рэдка хто гэтыя абавязкі ігнаруе.

— Калі раней прыходзілі прыбіраць свае магілкі перад Вялікаднем, то цяпер тройчы за сезон як мінімум, — кажа дэпутат. — Абкошваюць, добраўпарадкоўваюць, надмагіллі мяняюць, помнікі, агароджы. Вельмі шмат людзей звяртаецца ў сельсавет па інфармацыю аб продках, высвятляюць, калі памерлі іх бабулі, дзядулі, іншыя родныя. І тэлефануюць, і пішуць. Усё гэта сведчыць пра тое, што людзям не абыякава, як выглядаюць магілы іх сваякоў. Абазначаюць іх. Калі паглядзець даныя па інвентарызацыі за 2018 год, у нас былі адны абязлічаныя крыжы, а цяпер — амаль на кожным вісіць таблічка з імем. Людзі імкнуцца захаваць памяць ад продках.

### НЕ ЧАКАЮЦЬ, ШТО ЗРОБІЦЬ ХТОСЬЦІ

У Зэльвенскім раёне Гродзенскай вобласці ёсць вельмі паказальны прыклад работы па добраўпарадкаванні могілак. У Дзярэчынскім сельсавеце вы не знойдзеце ніводнага аб'екта, дзе была б бязладзіца, а тэрыторыя не была б абгароджана. Што адметна, 90 % усіх работ былі выкананы жыхарамі тэрыторыі сельсавета. Там людзі добра арганізаваліся, прывялі ўсе могілкі ў парадак і цяпер падтрымліваюць яго.

Як расказаў **старшыня Дзярэчынскага сельсавета Аляксандр БЕЛЯКАЛА**, работа па навядзенні парадку на могілках пачалася пяць гадоў таму. Цесна працавалі са старастамі і актыўнымі грамадзянамі.

— З таго часу ў нас атрымалася абгарадзіць 7 могілак, і 6 з іх дзякуючы людзям. Мы вельмі ганарымся нашымі жыхарамі, якія ніколі не застаюцца ўбаку. Яшчэ адны могілкі абгарадзілі дзякуючы гаспадарцы, якая прыйшла на дапамогу, таму што ў населеным пункце жыве вельмі мала людзей. Калі сродкі заставаліся, пускалі іх на выдаленне аварыйных дрэў. Напрыклад, жыхары вырашылі не чакаць планавай устаноўкі агароджы на могілках Марачы. Сабралі неабходныя сродкі, старшыня потым па ўсіх дакументах даваў справаздачу, што куды пайшло. Акрамя таго, самі арганізавалі прыборку аварыйных дрэў.

— Ёсць станоўчы прыклад у Каралінскім сельсавеце ў аграгарадку Міжэрычы. Людзі неаднаразова збіралі грошы, каб прыбраць аварыйныя дрэвы. Напрыклад, таполі па гадоў 50, дрэвы масіўныя, і іх сапраўды могуць прыбраць толькі прафесіяналы, — расказаў **старшыня Зэльвенскага раённага Савета дэпутатаў Вадзім ПАНАСІК**.

Па яго словах, на тэрыторыі раёна размяшчаецца 47 могілак на плошчы больш як 73 гектары. Вядома, усе гэтыя могілкі неабходна трымаць у парадку, абгарадзіць, таму вядзецца вельмі цесная работа са старшынямі сельвыканкамаў, са старастамі і святарамі.

— Такое ўзаемадзеянне дапамагае аператыўна скаапераваць людзей. Святар сумесна са старастам, напрыклад, прызначаюць дату суботніка, каб людзі прыйшлі, навялі парадак, — адзначыў Вадзім Панасік. — Калі патрэбная тэхніка нейкая, яна будзе, нават інвентар знойдзецца. І тут важна, каб у цэлым грамадзяне падтрымлівалі парадак, а не толькі на тэрыторыі вызначанага пахавання, бо да магілы трэба дайсці, таму павінна быць скошана трава, дарожка роўная. Так што мы ў раёне стараемся прыцягнуць жыхароў да сумеснай працы. І гэта дае свой вынік.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ, Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по комбинированной схеме (на повышение и понижение цены недвижимого имущества) по продаже имущества, принадлежащего **УП «Запад-Транснефтепродукт»** (Продавец).

**Электронные торги проводятся 20.11.2025.**

**Лот № 1:** VOLKSWAGEN TOUAREG.
VIN-номер WVGZZZ7LZ5D038054, 2004 г. в.
Начальная цена с НДС 20% – 11 521,39 руб.
Минимальная цена с НДС 20 % – 9 217,11.
Задаток – 1 152,14 руб.

**Лот № 2:** UAZ Hunter.
VIN-номер XTT315195K1000023, 2018 г. в.
Начальная цена с НДС 20% – 5 266,10 руб.
Минимальная цена с НДС 20 % – 4 212,88.
Задаток – 526,61 руб.

**Лот № 3:** UAZ HUNTER.
VIN-номер XTT315195J1001850, 2018 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 381,58 руб.
Минимальная цена с НДС 20 % – 4 305,26.
Задаток – 538,16 руб.

**Лот № 4:** UAZ HUNTER.
VIN-номер XTT315195K1000028, 2018 г. в.
Начальная цена с НДС 20% – 5 442,96 руб.
Минимальная цена с НДС 20 % – 4 354,36.
Задаток – 544,30 руб.

**Лот № 5:** UAZ HUNTER 315195.
VIN-номер XTT315195K1000029, 2018 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 7 861,87 руб.
Минимальная цена с НДС 20 % – 4 717,11.
Задаток – 786,19 руб.

**Лот № 6:** CHEVROLET NIVA 212300-55.
VIN-номер X9L212300F0557519, 2015 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 11 261,87 руб.
Минимальная цена с НДС 20 % – 6 757,11.
Задаток – 1 126,19 руб.

**Шаг электронных торгов на повышение** – 1 % от начальной цены.
**Шаг электронных торгов на понижение** – 10 % от начальной цены.

Порядок проведения электронных торгов, порядок регистрации на электронные торги определены Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке «GOSTORG» РУП «Институт недвижимости и оценки» (далее – ЭТП) и Правилами проведения электронных торгов по комбинированной схеме, размещенными на детальной странице лота на ЭТП.

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **18.11.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# КАЛІ АБ'ЯДНОЎВАЮЦЦА ЭНТУЗІЯСТЫ

## Як КОТГСы дапамагаюць у добраўпарадкаванні сталіцы

Пагадзіцеся, прыемна вяртацца з працы дадому, калі не толькі ва ўласнай кватэры, але і каля пад'езда, і ў найбліжэйшым двары тэрыторыя выглядае чыстай і добраўпарадкаванай. І калі ў прыватным доме даглядаць кветнікі, прыбіраць смецце і шмат іншых спраў — твае абавязкі, жыхарам шматкватэрных дамоў прасцей — за гэта пераважна адказваюць супрацоўнікі адказных службаў. Аднак ёсць і тыя неабыякавыя грамадзяне-энтузіясты, якія далучаюцца да калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (далей — КОТГС), каб дапамагчы ў добраўпарадкаванні. Сёлетнія вынікі іх дзейнасці абмеркавалі ў Мінскім гарвыканкаме.

**Жанчына акцэнтавала ўвагу, што чакаць людзей у кабінеце, калі надыходзіць час прыёму грамадзян, — не вельмі эфектыўны прыём. Яна ставіць столік проста на вуліцы — так людзі з ахвотай падыходзяць са сваімі пытаннямі і прапановамі.**

Асаблівасць КОТГСаў — функцыянаванне на абсалютна добраахвотнай аснове, у сувязі з чым узнікаюць кадравыя перастаноўкі і пэўны недахоп пераемнасці. Нягледзячы на гэта, неабыякавыя мінчане ўсё роўна працягваюць далучацца і прыкладваць намаганні дзеля развіцця горада. Больш за тое, у найбліжэйшыя гады заканадаўства аб мясцовым самакіраванні будзе мяняцца, што дазволіць КОТГСам развіваць шэраг перспектыўных кірункаў. У непасрэднай звязцы з імі павінны працаваць ТГСы і памочнікі дэпутатаў. На гэта падчас семінара ў Мінскім гарвыканкаме па выніках дзейнасці калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў 2025 годзе звярнуў увагу **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН**.

Ён таксама закрануў тэму Года добраўпарадкавання, рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў і правядзення конкурсу на найлепшы КОТГС. Сёлетні пераможца **старшыня КОТГС № 4 Першамайскага раёна Ніна МОРДЗІК** падзялілася сваім вопытам.





«Да добраўпарадкавання прыцягваем дзяцей, моладзь, ёсць спецыяльныя клумбы, за якія яны адказныя, — расказала Ніна Мордзік. — Ім вельмі падабаецца: яны пераймаюць вопыт у суседзяў, імкнуцца зрабіць лепш і цікавей. Дзякуючы грамадзянскай ініцыятыве для моладзі Першамайскага раёна таксама ўстанавілі спартыўны комплекс — і гэта толькі невялікая частка нашай работы. Што датычыцца грамадзянскіх ініцыятыў, яны сёлета, сапраўды, атрымалі новы імпульс і развіццё».

**Старшыня КОТГС № 130 ЖЭУ № 2 Фрунзенскага раёна Анжаліка КУХАРЧЫК** расказала аб выніках сваёй работы ў мясцовым самакіраванні: «За пяць гадоў зроблена даволі шмат. Акультураны чатыры футбольныя і валейбольныя пляцоўкі. Сумесна з адміністрацыяй Фрунзенскага раёна і «Зеленбудам» на закінутай пляцоўцы створаны парк «Сямейнае дрэва»: устанавілі мангалы, сталы, месца для гульняў дзяцей і не толькі».

Падчас семінара прадстаўнікі мясцовага самакіравання задавалі шмат пытанняў, якія датычыліся ўстаноўкі і замены дзіцячага гульнявога абсталявання, добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, аднаўлення тэрыторый пасля правядзення капітальнага рамонту, рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў і іншых тэм.

Як падкрэсліў Арцём Цуран, дэпутацкі корпус разлічвае, што ў 2026-м праектаў-пераможцаў грамадзянскіх ініцыятыў стане яшчэ больш, паколькі людзі бачаць, што гэта рэальна працуе. КОТГСы ў сваю чаргу — гэта ў пэўным сэнсе злучальны ланцужок паміж уладамі і мінчанамі, якія могуць сабрацца разам, абмеркаваць і вырашыць, як лепш добраўпарадкаваць свой двор. Варта нагадаць, што на тэрыторыі горада Мінска функцыянуюць 118 калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Каардынацыю іх дзейнасці ажыццяўляе Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота БелТА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**
доводит до сведения заинтересованных лиц информацию о внесении дополнений в проектную декларацию
*(опубликована в газете «Звязда» от 12.12.2024 № 242 (30376) с изменениями от 13.12.2024 № 243 (30377), от 14.02.2025 № 31 (30419), от 25.03.2025 № 58 (30446), от 30.05.2025 № 103 (30491), от 23.08.2025 № 162 (30550)*
**о строительстве жилых (нежилых) помещений и машино-мест в составе объекта строительства «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда»:**

– **жилые помещения** в составе объекта «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Вторая очередь строительства. Жилой дом № 1 по ГП (далее – жилой дом № 1);

– **машино-места, супермаркет** в составе объекта «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Вторая очередь строительства. Многоуровневая гараж-стоянка со встроенным супермаркетом № 3.2 по ГП (далее – гараж-стоянка № 3.2).

Для категории граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства на дату опубликования настоящих дополнений в декларацию по жилому дому № 1 предлагается **48 (сорок восемь)** жилых помещения (квартир) без приобретения машино-места, в том числе:

- **26 (двадцать шесть) двухкомнатных квартир:**
- № 42, № 46, № 50, № 54 (общая площадь 64,38 кв. м каждая);
- № 43 (общая площадь 69,71 кв. м);
- № 47 (общая площадь 66,34 кв. м);
- № 51, № 55 (общая площадь 64,02 кв. м каждая);
- № 98, № 102 (общая площадь 64,35 кв. м каждая);
- № 99 (общая площадь 69,51 кв. м);
- № 103 (общая площадь 66,71 кв. м);
- № 161 (общая площадь 64,4 кв. м);
- № 165 (общая площадь 70,02 кв. м);
- № 214, № 217, № 220, № 223, № 226, № 229 (общая площадь 69,8 кв. м каждая);
- № 215, № 218, № 221, № 224, № 227, № 230 (общая площадь 68,6 кв. м каждая);
- **22 (двадцать две) трехкомнатные квартиры**:
- № 41, № 53 (общая площадь 86,95 кв. м каждая);
- № 44, № 48, № 52, № 56 (общая площадь 80,87 кв. м каждая);
- № 45, № 49 (общая площадь 87,08 кв. м);
- № 97, № 101 (общая площадь 86,79 кв. м каждая);
- № 100, № 104 (общая площадь 80,92 кв. м каждая);
- № 160, № 164 (общая площадь 86,85 кв. м каждая);
- № 163, № 167 (общая площадь 80,85 кв. м каждая);
- № 213, № 216, № 219, № 222, № 225, № 228 (общая площадь 92,78 кв. м каждая).

**Цены на объекты долевого строительства:**

Стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

| Номер квартиры | Подъезд | Этаж | Количество комнат | Площадь жилого помещения (квартиры), $м^2$ | Стоимость 1 $м^2$ при 100 % оплате, бел. рублей | Стоимость 1 $м^2$ при условии кредитования в рамках партнерских кредитных программ*, при оплате по графику платежей, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 42, 43, 46, 47, 98, 99, 102, 103, 161, 165, 214, 215, 217, 218, 220, 221, 223, 224, 226, 227, 229, 230 | 1–4 | 11–16 | 2 | 64,35–70,02 | 5 500,00 | 5 729,00 |
| 50, 51 | 1 | 13 | 2 | 64,02; 64,38 | 5 700,00 | 5 938,00 |
| 54, 55 | 1 | 14 | 2 | 64,02; 64,38 | 6 500,00 | 6 771,00 |
| 41, 44, 45, 48, 97, 100, 101, 104, 160, 163, 164, 167, 213, 216, 219, 222, 225, 228 | 1–4 | 11–16 | 3 | 80,85–92,78 | 5 000,00 | 5 208,00 |
| 49, 52 | 1 | 13 | 3 | 80,87; 87,08 | 5 200,00 | 5 417,00 |
| 53, 56 | 1 | 14 | 3 | 80,87; 86,95 | 6 000,00 | 6 250,00 |

**Банками-партнерами являются ОАО «АСБ Беларусбанк», ОАО «Белинвестбанк».*

**Условия оплаты для квартир остаются неизменными.**

**Заявления** о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) со следующего дня после публикации настоящих дополнений в проектную декларацию в порядке очереди по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105. Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться после получения уведомления от ГПО «Минскстрой» (посредством телефонной связи, сообщения в Viber, Telegram), но не ранее 7 (семи) календарных дней после опубликования настоящих дополнений по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105, с физическими и юридическими лицами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

ГПО «Минскстрой» имеет право отказать в заключении договора создания объекта долевого строительства без объяснения причин.

Условия декларации, не измененные (не исключенные) настоящим извещением, остаются неизмененными.

Подробные сведения об объекте строительства, планировках квартир и ходе строительства можно получить в отделе реализации объектов недвижимости и жилья по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105, тел. моб. +375 29 195 18 21 либо на сайтах: https://minskstroy.by, http://www.uyutnyi.by.

# «АДЗІН ДЗЕНЬ У АРГАНІЗАЦЫІ», «ДЭПУТАЦКАЕ НАСТАЎНІЦТВА»

## Аляксандр ШЫПУЛА — аб уласных праектах у рабоце з выбаршчыкамі

**Прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы з працоўнымі калектывамі, дыялогі з моладдзю — жыццё дэпутата заўсёды насычана стасункамі з выбаршчыкамі... Яно і не дзіўна, бо, як часта адзначаюць самі дэпутаты, чужых праблем не бывае. Такога меркавання прытрымліваецца і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўніоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыкі Аляксандр ШЫПУЛА. Ён расказаў пра галоўныя аспекты работы ў сваёй 62-й Барысаўскай гарадской акрузе.**


Дэпутат Аляксандр ШЫПУЛА падчас сустрэчы з навучэнцамі Барысаўскай сярэдняй школы № 13.

Аляксандр Шыпула родам з Віцебшчыны, але са сваёй выбарчай акругай, у якой сёння пражывае каля 80 тысяч чалавек, уключаючы дзяцей, знаёмы не па чутках. У 2001 годзе будучы дэпутат звязаў сваё жыццё з Барысавам, прайшоў тут усе ступені кар'еры медыка — ад пасады ўрача-акушэра-гінеколага да галоўнага ўрача Барысаўскага радзільнага дома. Дарэчы, работа з выбаршчыкамі для Аляксандра Валер'евіча не новая. Ён з'яўляўся дэпутатам Барысаўскага райсавета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў і Мінскага аблсавета дэпутатаў 28-га склікання, старшыня Пастаяннай камісіі па развіцці сацыяльнай сферы. У 2019 годзе Аляксандр Шыпула быў абраны дэпутатам Палаты прадстаўнікоў 7-га склікання. Адказнае стаўленне да справы, высокі аўтарытэт у выбаршчыкаў дазволілі дэпутату працягнуць працу ў Палаце прадстаўнікоў і ў 8-м скліканні.

Дэпутаты штомесяц актыўна працуюць у сваіх выбарчых акругах, і кастрычнік — не выключэнне. Аляксандр Шыпула расказвае аб сваёй дзейнасці ў рэжыме, можна сказаць, рэальнага часу, напрыклад, пра нядаўні прыём грамадзян у Барысаўскім райвыканкаме. «Тэматыка пытанняў, як заўсёды, самая розная: аб удасканаленні заканадаўства ў сферы прадпрымальніцкай дзейнасці, работа ЖКГ, капітальны рамонт дамоў, якасць аказання медыцынскіх паслуг, складаная канфліктная сітуацыя паміж членамі садаводчага таварыства, даванне арэнднага жылля, — адзначае дэпутат. — Шэраг пытанняў вырашаецца адразу ў ходзе прыёму, дзякуючы аператыўнай рабоце з кіраўнікамі аддзелаў Барысаўскага райвыканкама, частка пытанняў бяруцца на дэпутацкі кантроль і адпрацоўваюцца сумесна з арганізацыямі, у чыю кампетэнцыю ўваходзіць іх рашэнне».

У сваёй акрузе Аляксандр Шыпула рэалізуе праект «Адзін дзень у арганізацыі». «Ён накіраваны на паглыбленае вывучэнне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў канкрэтнай арганізацыі праз розныя формы работы: сустрэча з кіраўніком прадпрыемства з абмеркаваннем стану спраў на прадпрыемстве і перспектыў развіцця, інфармацыйная сустрэча з працоўным калектывам, наведванне вытворчасці і стасункі з рабочымі на месцах, правядзенне выязнога прыёму для работнікаў прадпрыемства», — тлумачыць дэпутат.

У кастрычніку ў рамках работы ў акрузе ён правёў сустрэчы з працаўнікамі працоўных калектываў ААТ «Лесахімік» і Барысаўскага доследнага лясгаса. Паколькі ў кастрычніку шмат дат, прысвечаных сям'і, у размовах з людзьмі дэпутат асаблівую ўвагу надаў тэме захавання сямейных каштоўнасцяў і ролі сям'і ў нашым грамадстве, мерах дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей.

Дэпутат-урач, безумоўна, цікавіцца і арганізацыяй работы ўстаноў аховы здароўя і якасцю аказання медыцынскіх паслуг у сваёй акрузе. «На сёння на дэпутацкім кантролі стаяць пытанні правядзення капітальнага рамонту паліклінікі № 3 Барысаўскай цэнтральнай раённай бальніцы, — расказвае Аляксандр Валер'евіч. — Работы ўжо падыходзяць да завяршэння. Яшчэ адзін важны аб'ект не толькі для барысаўчан, але і Мінскай вобласці — будаўніцтва станцыі пералівання крыві на тэрыторыі нашай цэнтральнай раённай бальніцы. Гэта будзе не проста станцыя, а сучасны шматфункцыянальны цэнтр трансфузіялогіі. Будаўніцтва ідзе поўным ходам. Такі цэнтр проста неабходны рэгіёну, які ўзяў курс на стварэнне Усходне-тэрытарыяльнага цэнтра спецыялізаванай высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі».

Важнае месца ў рабоце ў акрузе Аляксандр Шыпула адводзіць моладзі. «Вось ужо на працягу пяці гадоў рэалізую праект «Дэпутацкае настаўніцтва», — расказвае ён. — Мэта праекта — грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі, захаванне гістарычнай памяці і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, прафесійная арыентацыя навучэнцаў старэйшых класаў. Ужо другі год я працую з навучэнцамі барысаўскай сярэдняй школы № 18. Сёлета ў кастрычніку па маёй ініцыятыве была арганізавана для школьнікаў экскурсія ў Барысаўскую ўзбуйненую друкарню. Асноўная мэта сустрэчы — пазнаёміць вучняў з вытворчасцю і прадукцыяй друкарні, прафесіямі дадзенага кірунку эканамічнай дзейнасці».

У завяршэнні тыдня работы ў акрузе разам з ідэалагічным актывам раёна, супрацоўнікамі Барысаўскага доследнага лясгаса дэпутат прыняў удзел у Рэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Дай лесу новае жыццё!».

«Адзін з прыярытэтаў маёй дзейнасці — уважлівае стаўленне да чалавека і яго праблем, — гаворыць Аляксандр Шыпула. — Я стараюся слухаць і чуць выбаршчыкаў, дапамагаць ім у вырашэнні праблем у меру сваіх магчымасцяў. Працаваць над павышэннем якасці, жыцця, асабліва ў пяцігодку якасці, — задача першараднай важнасці для кожнага дэпутата».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота з архіва Аляксандра ШЫПУЛЫ.**


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Лепельпромшвеймебель»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2433 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-14073 (назначение – Здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – Швейный цех, общая площадь – 1945,1 м.кв, составные части и принадлежности – Подвал, уборная, ограждение, четверо ворот, три калитки, два покрытия); Вентилятор, инв. № 399; Вентилятор, инв. № 322; Вентилятор ВЦ-5, инв. № 388; Вентилятор центробежный, инв. № 389; ГЕРАН ЛЮКС ПГУ-1-100, инв. № 949; ГЕРАН ПГУ-1-300, инв. № 950; ГЕРАН ПГУ-С-153, инв. № 951, Кран-балка, инв. № 329; Лебедка првод-электр С508, инв. № 403; Машина швейная Minerva мод. 428-2 № 3407 + приспособление для светоотр. ленты 25 мм, инв. № 910; Механическая щетка, инв. № 575; Нож швейный, инв. № 448; Парогенератор Gold Eagle DL-7, инв. № 952; Печь СВЧ Горизонт 20MW800-1378, инв. № 2343; Печь СВЧ Горизонт 20MW800-1378, инв. № 2345; Плита газовая, инв. № 622; Плотер JETLINK -180 N, инв. № 923; Принтер HP, инв. № 686; СТЕГАЛЬНАЯ МАШИНА Machine tech 1-61 m, инв. № 827; Стол Gold Eagle DL-1068, инв. № 653; Тележка ТС, инв. № 429438; Факс, инв. № 3200; Швейная машина 876, инв. № 558; Швейная машина 852, инв. № 235; Швейная машина 852, инв. № 319; Швейная машина 852, инв. № 247; Швейная машина 852, инв. № 321; Швейная машина 852, инв. № 574; Швейная машина 852*5, инв. № 46; Швейная машина 852*5, инв. № 288; Швейная машина 852*5, инв. № 311; Швейная машина пуговичная, инв. № 599; Шкаф холодильный, инв. № 633; Электроплита, инв. № 634 | 287430,12 | 28743,01 | 14371,51 |

В отношении лота проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 20.09.2025

Местонахождение: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Володарского, 1/2

Лот № 2433 расположен на земельном участке с кадастровым номером 241200000001000283, площадь – 0,9829 га, назначение – Земельный участок под производственную базу.
Земельный участок является неделимым, предоставлен на праве аренды (доля в праве – 87/100).
Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель.
Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код – 2,4, площадь – 0,9829 га.
На часть земельного участка имеется сервитут.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **12 ноября 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 29 октября 2025 года до 16.00 10 ноября 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту 2433, ОАО «Лепельпромшвеймебель», проводимых 12.11.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 4 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать (заключить) с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Ирина Сигизмундовна +375298903354.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Лепельпромшвеймебель» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: 8 (017) 255-29-28, 8 (029) 576 77 15; e-mail: kp@p-k.by (211969, Республика Беларусь, Витебская обл., г. Лепель, ул. Володарского, д. 1, УНП 30038815)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»
220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

Данная отчетность опубликована на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by

Форма 1

## Бухгалтерский баланс 30 сентября 2025 г.

ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30.09.2025 | 31.12.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 213 015 | 219 244 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 1 217 | 8 423 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 393 285 | 460 522 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 571 804 | 656 961 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 937 959 | 771 706 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 3 222 572 | 3 167 380 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 3 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 2 125 | 1 675 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 183 219 | 190 532 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 610 | 245 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 6 936 | 6 209 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 24 341 | 34 914 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **5 557 086** | **5 517 811** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 3 352 | 3 956 |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 725 176 | 885 995 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 3 640 429 | 3 502 231 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 30 666 | 28 899 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 3 | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 64 503 | 46 865 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 4 464 129 | 4 467 946 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 407 982 | 348 161 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 247 350 | 186 450 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса и резервы | 1214 | | 88 373 | 78 118 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 349 252 | 437 136 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 1 092 957 | 1 049 865 |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **5 557 086** | **5 517 811** |

Форма 2

## Отчет о прибылях и убытках за 9 месяцев 2025 г.

ОАО «Белгазпромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 30.09.2025 | 30.09.2024 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 410 614 | 289 756 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 208 609 | 126 659 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | | 202 005 | 163 097 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 139 744 | 152 052 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 51 427 | 50 272 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | | 88 317 | 101 780 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 3 318 | 2 726 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 3 931 | (122) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 31 307 | 43 250 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 54 | 18 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 8 635 | 41 691 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 4 562 | 44 964 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 167 023 | 167 450 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 9 829 | 6 960 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 148 007 | 139 612 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 23 229 | 21 998 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **124 778** | **117 614** |

Заместитель председателя правления Л.В. Кондратович

Заместитель главного бухгалтера И.Н. Вашкевич

Дата подписания: 02 октября 2025 г.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 29.01.2025. УНП 100429079*





# САКРАЛЬНАЯ КАЛЯ ЗАВЕТНАГА

## У выніку рэалізацыі грамадзянскай ініцыятывы «Чыстыя вытокі» добраўпарадкавана крыніца каля вёскі Заветнае ў Сенненскім раёне

За прыклад ініцыятыўная група ўзяла Трафімаву крыніцу на малой радзіме Прэзідэнта, у Александрыі.

У выніку перамогі ў конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў 18 тысяч рублёў на добраўпарадкаванне выдзелілі з мясцовага бюджэту, яшчэ 2 тысячы рублёў, або 10 % ад усяго кошту ўвасаблення праекта, ахвяравалі самі жыхары і арганізацыі.

За гэтыя сродкі набылі калодзежныя кольцы, неабходныя матэрыялы для агароджы, абароннага навеса і іншых патрэб. Да таго ж прадпрыемствы раёна выдзялялі тэхніку, пабудавалі альтанку.

Добраахвотнікі арганізоўвалі суботнікі амаль кожны тыдзень на працягу двух з паловай летніх месяцаў. Да прыборкі смецця, выдалення залішняй расліннасці далучаліся жыхары не толькі найбліжэйшых населеных пунктаў Сянно і Багушэўска, але і госці з Брэста, Мінска — ураджэнцы тутэйшых мясцін.

Талакою дэманціравалі крутую драўляную лесвіцу, якая абмярзала ў халодную пару года, замянілі яе на новую металічную са зручнымі парэнчамі. Вычысцілі месца вытоку, падсыпалі шчэбнем дарогу і аўтастаянку, устанавілі на патрэбным павароце ўказальны знак. А яшчэ пасадзілі навокал дрэвы.

«Папярэдне мы заказалі лабараторны аналіз вады з крыніцы, — расказаў старшыня Багушэўскага сельсавета Вячаслаў Багданаў. — Даследаванні паказалі, што яна чыстая, утрыманне жалеза і нітратаў ніжэйшае за ўстаноўленыя для пітной вады нормы. Тэсціраванне праводзілі і пасля ўладкавання новай крыніцы, аказалася, вада стала яшчэ чысцейшай».

Існуе паданне, што крыніца, асвечаная ў гонар Пятра і Паўла, біла з-пад зямлі каля Заветнага яшчэ сто гадоў таму, яе ваду людзі лічылі гаючай, лячылі ёю хваробы. І хоць пісьмовых і іншых пацвярджэнняў паданню не знайшлі, аддаючы даніну павагі мінуламу, у дзень урачыстага адкрыцця крыніцу асвяцілі ў імя апосталаў, устанавілі паклонны крыж.



Вячаслаў СТАНАВЕНКА ўручае сімвалічны ключ ахоўніка крыніцы ляснічаму Сафіёўскага лясніцтва Багушэўскага лясгаса Алегу КАЗЛОВУ.

> У выніку перамогі ў конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў **18 тысяч рублёў** на добраўпарадкаванне выдзелілі з мясцовага бюджэту, яшчэ **2 тысячы рублёў**, або **10 %** ад усяго кошту ўвасаблення праекта, ахвяравалі самі жыхары і арганізацыі.

«Я з маленства ведаў пра гэты выток, хадзіў да яго па ваду з бабуляй, — успамінае **кіраўнік праекта, загадчык кафедры факультэцкай хірургіі ВДМУ, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Вячаслаў СТАНАВЕНКА**. — Для многіх тутэйшых жыхароў гэта адметнае, сакральнае месца. Цяпер няхай і іншыя наталяюць смагу вадой з глыбінь нашай зямлі».

Вячаслаў Станавенка разам з аднадумцамі, сярод якіх рэктар акадэміі сучаснай сям'і (Масква) Марыя Праскурава, ветэран пагранічных войск Вячаслаў Пулко, аб'ядналіся ў суполку «Патрыёты Багушэўска». Пры іх непасрэдным удзеле на малой радзіме, у Багушэўску, адкрыты помнік землякам — воінам-інтэрнацыяналістам, а таксама скульптура «Рэха кахання» ў памяць аб сям'і Багушэўскіх. Палкоўнік Дзмітрый Багушэўскі бязвыплатна перадаў кавалак уласнай зямлі пад будаўніцтва чыгуначнай станцыі пры ўмове, што яна будзе насіць імя яго жонкі Марыі — Багушэўская. Ініцыятыўная група дапамагае зрабіць больш відовішчнымі святы землякоў, мае многа новых цікавых задум. Сённяшнія патрыёты дзейнічаюць пад дэвізам «Ганарымся мінулым, будуем цяперашняе, упэўнены ў будучыні».

**Святлана ЯКАЎЛЕВА**
**Фота з адкрытых крыніц.**





Мясцовае Самакіраванне — Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 12 560. Нумар падпісаны ў 19.30 28 кастрычніка 2025 года.**

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

# «ТРЭБА ЖЫЦЬ САБЕ Ў ЗАДАВАЛЬНЕННЕ. А ЗНАЧЫЦЬ — ПРАЦАВАЦЬ.»

...Не так даўно гуляў я з праўнукам каля Гальшанскай школы, куды ён хутка пойдзе вучыцца, і як жа здзівіўся, калі сустрэў там свайго даўняга знаёмага Сямёна Александровіча. Некалі ён працаваў шафёрам у нашай ПМК-25. Ім жа, кіроўцам, нягледзячы на пенсійны ўзрост, працуе і сёння.

Нарадзіўся Сямён Якаўлевіч у шматдзетнай сям'і. Маленства ды юнацтва яго былі тыповымі для вёскі: дом, гаспадарка, дапамога бацькам. Змалку давялося пасвіць, даглядаць скаціну, збіраць грыбы і ягады, араць, баранаваць, касіць і сушыць сена... А да ўсяго недзе з пятага класа хлопчык стаў прападаць на саўгасным машынным двары. Яму цікава было глядзець, як рамантуецца тэхніка, камусьці з «рамонтнікаў» падаць нейкую жалезку ці гаечны ключ, а потым смялей папрасіцца ў кабіну, проста пасядзець за рулём. І ўжо верхам шчасця — трохі праехаць.

Не дзіва, што адразу пасля школы хлопец займеў прафесію шафёра, палюбіў дарогу і зносіны з людзьмі, прычым назаўсёды. За дзесяцігоддзі працы дзе ён толькі ні пабываў, чаго (і каго!) толькі ні перавозіў! Пачынаў з паліва для будаўнічай тэхнікі, цэглы, пяску, цэменту, адвозу камянёў і ўраджаю, сабраных на калгасных палетках. Шмат гадоў адпрацаваў у Ашмянскім райспажыўсаюзе, выйшаў на сапраўды заслужаны адпачынак. Здавалася б, цяпер ужо мог бы не хадзіць на работу, займацца нейкімі хатнімі справамі. Але ж гэта, як прызнаецца, не з яго характарам. «Пакуль вочы бачаць, а ногі ходзяць, — смяецца Сямён Якаўлевіч, — трэба жыць сабе ў задавальненне. А як па мне — дык гэта працаваць».



У кіроўцы цяпер вельмі цікавая работа. З усёй акругі ў прызначаны час ён на школьным аўтобусе збірае дзяцей і прывозіць іх на заняткі ў школу, пасля іх — з добрымі ці дрэннымі адзнакамі — развозіць па дамах, круціць баранку. «Ніколі ў мяне нават думкі не было змяніць прафесію, — прызнаўся суразмоўца», у якога, дарэчы, абодва сыны працуюць шафёрамі.

**Мікалай БАЛЫШ,**
*г. Ашмяны.*

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

# «ПАКУЛЬ СЫНКІ МАЛЫЯ, ХАЙ ПАСЯДЗЯЦЬ НА ШЫІ...»

На календары — кастрычнік... Некалі са здзіўленнем дазналася, што ў гэтым месяцы нашы продкі апрацоўвалі лён і каноплі, у адходах было шмат кастрыцы (цвёрдых часцінак сцёблаў), адкуль і назва.
Мне ж здавалася, што яна ад... кастроў, бо навокал столькі яркага, прыгожага, цёплага... Безумоўна, вартага пэндзля мастака ці (у маім выпадку) добрых здымкаў на памяць.

Для таго каб у кастрычніку іх зрабіць, далёка хадзіць не трэба: у нашым жа школьным двары дзясяткі барвовых клёнаў!

Да іх у тую раніцу я крочыла не адна: з суседняга пад'езда выйшла цікавая парачка — маладая паўнаватая жанчына за ручку вывела сваё сонейка — рыжавалосага сынка-другакласніка.

Хлопчык на свае сем-восем гадкоў досыць высокага росту, укормлены. Але пры гэтым яго ярка-зялёны заплечнік з вялікай мяккай цацкай красаваўся за спінай матулі. У яе ж — у «свабоднай» руцэ — быў пузаты пакет і жаночая сумка.

За размовай, што такое аднназначнасць, парачка (я следам...) дайшла да будынка школы.

...Ганак там досыць высокі — прыступак шмат. Якраз іх у тую хвіліну «штурмаваў» равеснік «рыжыка» — хударлявы хлопчык, хворы на ДЦП. Ён у дзве рукі трымаўся за парэнчы, злёгку падскокваў на кожнай прыступцы, папраўляў заплечнік за спінай.

Па ўсім было відаць, што «дарога» даецца мальцу нялёгка, аднак ён упарта і досыць упэўнена адольваў яе — ішоў уверх, дзе яго чакала матуля.

Перад мудрасцю гэтай жанчыны, якая дазволіла свайму дзіцяці самому адольваць цяжкасці, я міжвольна схіліла галаву.

Нічога дрэннага няма, як быццам, і ў апецы маёй суседкі (па прыступках маці несла свайго рыжыка ледзь не на руках). Але ж ёй варта ведаць: тое, што дастаецца без намаганняў, у будучым можа ўспрымацца як належнае. Перавучвацца вельмі цяжка. Як пісаў нехта з чытачоў «Звязды»: «Пакуль сынкі малыя, / Хай пасядзяць на шыі. / Ды прыйдзе ж паўналецце, / Ці будзе ласка злезці?»

Вось у чым пытанне. Адказу на яго (а тым больш адназначнага) у мяне няма.

**Наталля ШАСТАКОВА,**
*г. Гомель.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 3»

проводит **14 ноября 2025 года в 11.00** повторный открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

2. Сведения об имуществе и его местонахождении, начальная цена.

**К отчуждению предлагается имущество ОАО «ДСТ № 3», расположенное по адресу: Могилевская обл., Костюковичский р-н, г. Костюковичи, ул. Кулешова, 17А.**

| № | Наименование |
|---|---|
| | **Капитальные строения** |
| 1 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2861, общей площадью – 842,0 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения; наименование – здание производственно-бытового корпуса, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 2 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2862, общей площадью – 953,0 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения; наименование – здание лабораторного корпуса, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 3 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2863, общей площадью – 18,0 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – проходная, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 4 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2866, общей площадью – 220,0 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование – мазутохранилище 500 т, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 5 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2869, общей площадью – 162,0 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание столярного цеха; составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 6 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-2873, общей площадью – 879,0 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения; наименование – здание ремонтной мастерской, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 7 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-3195, общей площадью – 15,0 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения; наименование – пристройка к лабораторному корпусу (здание котельной), составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 8 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5798, общей площадью – 69,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения; наименование – эстакада № 2, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 9 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5800, общей площадью – 69,0 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – обменный пункт; составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 10 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5801, общей площадью – 53,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения; наименование – эстакада № 1, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 11 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5802, общей площадью – 704,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения; наименование – площадка для складирования металлолома, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 12 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5803, общей площадью – 4,0 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – КНС, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 13 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5804, общей площадью – 221,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение КНС, составные части и принадлежности – ограждение КНС |
| 14 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5805, назначение – сооружение неустановленного назначения; наименование – ограждение, составные части и принадлежности – 2 ограждения, 2 ворот |
| 15 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5806, общей площадью – 229,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение площадки складирования, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 16 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5811, назначение – сооружение неустановленного назначения; наименование – сети водопровода, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 17 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5812, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сети тепловые наружные, составные части и принадлежности – сети тепловые наружные |
| 18 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5813, назначение – сооружение неустановленного назначения; наименование – наружные канализационные сети; составные части и принадлежности – наружные канализационные сети |
| 19 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5818, общей площадью – 46,0 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание мазутохранилища, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 20 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5819, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – очистные сооружения, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 21 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5821, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сети электроснабжения, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 22 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5834, общей площадью – 3444,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство производственной базы, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 23 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-5901, общей площадью – 5306,0 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство лабораторного корпуса, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| 24 | капитальное строение с инвентарным номером 732/С-6505, общей площадью – 21,8 кв. м, назначение – здание специализированное энергетики, наименование – здание автозаправочной станции, составные части и принадлежности – сведения отсутствуют |
| | **Зеленые насаждения** |
| 25 | Зеленые насаждения, инв. № 683 |
| 26 | Зеленые насаждения, инв. № 164 |
| 27 | Зеленые насаждения, инв. № 163 |
| | **Оборудование и ТМЦ** |
| 28 | Стенд плакатов-пособий, инв. № 157 |
| 29 | Топливораздаточная колонка «Нара27М1С», инв. № 822 |
| 30 | Топливораздаточная колонка «Нара27М1С», инв. № 823 |
| 31 | Емкость 25 $м^3$, инв. № 814 |
| 32 | Компрессор ПКС-5.25Д, инв. № 765 |
| 33 | Кран-балка, инв. № 766 |
| 34 | Кран-балка, инв. № 767 |
| 35 | Молот наковальный, инв. № 774 |
| 36 | Емкость 10 $м^3$, инв. № 815 |
| 37 | Емкость 25 $м^3$, инв. № 816 |
| 38 | Емкость 25 $м^3$, инв. № 817 |
| 39 | Емкость 25 $м^3$, инв. № 818 |
| 40 | Емкость, 5 $м^3$, инв. № 819 |
| 41 | Емкость, 5 $м^3$, инв. № 820 |
| 42 | Емкость, 5 $м^3$, инв. № 821 |
| 43 | Наковальня, инв. № 855109 |
| 44 | Склад для хранения нефтепродуктов, инв. № 653 |
| 45 | Шкаф для одежды, 16 шт., инв. № 872007 |
| 46 | Шкаф металлический, 7шт, инв. № 679 |
| 47 | Щит пожарный закрытый ЩПЭ-С, инв. № 902771 |
| 48 | Электрощит-распределитель, 10 шт., инв. № 20210 |
| 49 | Котел стальной водогрейный, инв. № 691 |
| 50 | Котел стальной водогрейный, инв. № 692 |
| 51 | Сети электроснабжения, инв. № 694 |
| 52 | Гелиоводонагревательная установка с солнечным коллектором, инв. № 696 |
| 53 | Стружкоотсос 230В, инв. № 705 |
| 54 | Электроводонагреватель ЭВА-450, инв. № 723 |
| 55 | Емкость для хранения мазута У-200, инв. № 714 |
| 56 | Станок деревообрабатывающий строгальный, инв. № 718 |
| 57 | Станок комбинированный СР-3.01, инв. № 719 |
| 58 | Насосная канализационная станция (насос марки НКФ-54), инв. № 700 |
| 59 | Деревянный навес, инв. № 229 |
| 60 | Вентилятор ВЦП 7-40 № 3,15(2.2/3000) ПР, инв. № 4250 |
| 61 | Шкаф металлический, 14 шт. инв. № 679 |

Имущество по частям не продаётся.

Суммарная начальная цена на имущество с учетом снижения на 10 процентов составляет 1 357 719,53 бел. руб. без НДС (один миллион триста пятьдесят семь тысяч семьсот девятнадцать рублей пятьдесят три копейки). Размер задатка 135 771,95 бел. руб. (сто тридцать пять тысяч семьсот семьдесят один рубль девяносто пять копеек).

3. Информация о земельном участке. Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельном участке площадью 2,8116 га с кадастровым номером 723550100001005404 (право постоянного пользования подтверждено свидетельством о государственной регистрации № 732/1949-3331 от 10.07.2024).

4. Дата, время и место проведения аукциона: **14.11.2025 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **10.11.2025; время: 17.00.**

При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. На участие в аукционе к заявлению прилагается:

- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора - для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;
- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;
- доверенность (в случае необходимости).

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

9. Сроки подписания договора купли-продажи имущества. Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

10. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

11. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 28.08.2025 и на сайте ОАО «ДСТ № 3».

У ДОБРЫ ШЛЯХ

# У САМАЕ СЭРЦА ТРАПІЧНАЙ АЗІІ

## «Белавія» адкрыла прамы рэйс на Шры-Ланку

**Нацыянальная авіякампанія «Белавія» пачала выконваць прамыя рэйсы на Шры-Ланку. Запуск маршруту Мінск — Матала атрымаўся сімвалічны — ён супаў з 25-годдзем усталявання дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі. Першы самалёт Airbus A-330-200 цалкам быў запоўнены, што сведчыць пра вялікую цікавасць беларусаў да трапічнага напрамку.**



Аэрапорт прызначэння — Матала, месца экзотыкі і прыгод. Размешчаны ён у паўднёвай частцы краіны — там падарожнікаў сустракае трапічная зеляніна, а да акіяна — рукой падаць. Дарога на сонечны востраў займае каля дзевяці з паловай гадзіны.

**Генеральны дырэктар «Белавія» Ігар ЧАРГІНЕЦ** адзначыў, што запуск новага маршруту стаў лагічным працягам пашырэння далёкіх напрмкаў кампаніі: «Літаральна за адзін месяц мы адкрылі тры важныя напрамкі — Санья (востраў Хайнань, Кітай), Фукуок (В'етнам) і цяпер Шры-Ланка. Мы бачым вялікую цікавасць да гэтага напрамку з боку беларусаў — упэўнены, што колькасць падарожнікаў падвоіцца. У сваю чаргу, чакаем і росту патоку гасцей са Шры-Ланкі — у тым ліку студэнтаў, якія вучацца ў Беларусі».

Генеральны дырэктар «Белавія» таксама дадаў, што рэйс фармальна мае статус чартарнага, але кампанія разглядае перспектыву зрабіць яго рэгулярным. Па словах Ігара Чаргінца, загрузка на першыя палёты вельмі добрая, а асноўныя вынікі — станоўчыя.

Новы маршрут не толькі адкрывае беларусам шлях да акіяна і вядомых на ўвесь свет чайных плантацый Цэйлона, але і стварае дадатковыя магчымасці для развіцця супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспублікі Шры-Ланка ў Расіі Шабіні ГУНАСЕКЕРА** адзначыла, што гэта падзея мае асаблівае значэнне для абедзвюх дзяржаў. «Сёння мы не проста адкрываем новы рэйс — мы адкрываем новую главу ў гісторыі нашых адносін. Гэта гістарычны момант», — заўважыла дыпламат. Паводле яе слоў, авіязносіны ў сучасным свеце — гэта значна больш, чым проста злучэнне двух аэрапортаў: «Гэта мост паміж народамі. Ён спрыяе развіццю гандлю, эканомікі, дружбы і культурнага супрацоўніцтва. Кожны новы маршрут адкрывае новыя магчымасці — для турызму, інвестыцый, адукацыі».

Пасол падкрэсліла, што «Беларусь — важны і перспектыўны напрамак. У мінулым годзе Шры-Ланку наведалі каля дзесяці тысяч беларусаў, і мы ўпэўнены, што з адкрыццём прамога рэйса гэта колькасць толькі павялічыцца». Дыпламат таксама расказала, што краіна прывабная не толькі для пляжнага адпачынку, але і для вясельнага, аздараўленчага, культурнага, спартыўнага і гастранамічнага турызму. Асобна яна адзначыла значэнне адукацыйных сувязяў паміж краінамі: цяпер у Беларусі навучаецца шмат студэнтаў са Шры-Ланкі. Прамы рэйс дапаможа зрабіць гэтыя кантакты больш зручнымі.

Такім чынам, адкрыццё авіярэйса «Мінск — Матала» стала не проста чарговым этапам у развіцці авіязносін, а важным крокам у збліжэнні дзвюх краін. Новы маршрут адкрывае магчымасці для пашырэння турыстычных і эканамічных кантактаў, умацавання культурнага дыялогу і міжчалавечых сувязяў. Пад гукі першай пасадкі ў тропіках Шры-Ланкі пачынаецца новая старонка беларуска-ланкійскага супрацоўніцтва — са спадзяваннем, што гэта працяг доўгатэрміновага партнёрства і ўзаемнага адкрыцця дзвюх краін адна для адной.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**

# ЖУРАЎЛІНАЯ ЭЛЕГІЯ

*Прысвячаецца Дню белых жураўлёў — 22 кастрычніка.*



**Па гарызанталі: 1.** «Узнік у небе жураўліны ...». З верша Д. Пятровіча «Заснула лета». **2.** Шырокі ціхі ўчастак ракі. **4.** ... здаецца высокім — да ветру (прыкм.). **6.** Беларускае слова «шпона» ў перакладзе на рускую мову. **8.** «А мне мілей ... журавінны». З верша Н. Вайцяховіча «Размова з жоравам». **9.** «Сыходзяць у вечнасць лаўшыя ... , // Растаў у небе жураўліны клін». З верша С. Акулава «Жураўлі над вайной». **13.** ... ў жураўля дарога — на цёплыя воды (прык.). **16.** Балтыйскія плямёны, якія некалі насялялі паўднёвае ўзбярэжжа Балтыйскага мора. **17.** ... Гамзатаў. Імя дагестанскага паэта, у вершы «Жураўлі» якога сцвярджаецца, што загінулыя ў апошнюю вайну салдаты ператварыліся ў белых жураўлёў. **18.** Беларускае дзявочае імя. **20.** «Калі ... пералёту // Абвесціць звонка жураўлі». З верша С. Грахоўскага «Зачараванасць». **22.** Нота музычнай гамы. **23.** Хімічны элемент. **24.** Арганізацыя, якая займаецца работамі па падрадах. **25.** Прадукт творчай працы. **26.** Адрэзак паласы ворнай зямлі (устар.).

**Па вертыкалі: 1.** Той, хто едзе на кані вярхом. **3.** Лепш ... ў руках, чым журавель у небе (прык.). **5.** «Каб любіць ... нашу мілую». З песні «Жураўлі на Палессе ляцяць»: (сл. А. Ставера, муз. І. Лучанка). **7.** « І далей на ... ляцяць жураўлі». З верша Я. Коласа «Жураўліны вырай». **10.** Зямельная мера ў некаторых краінах. **11.** ... , або дабрабыт. Носьбітам яго лічылі жураўля; убачыўшы яго, казалі: «Будзь здароў!» **12.** Старана, працілеглая пярэдняй. **14.** ... стаўбом — да марознага надвор'я (прыкм.). **15.** Невялікі лес. **16.** Ранні ... жураўлёў — ранняя вясна (прыкм.). **19.** «Вельмі любіць журавель // ... — кіслінкі». З верша А. Дзяржынскага «Журавінкі». **20.** «Як птушка, душа ўстрапянецца, // Пачуўшы ... жураўліны». З верша М. Маляўкі «Покуць». **21.** «У небе ... жуpавоў, як званок». З верша А. Анісовіча «Дзівак».

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі: 1.** Клін. **2.** Плёс. **4.** Неба. **6.** Шпон. **8.** Край. **9.** Салдаты. **13.** Адна. **16.** Прусы. **17.** Расул. **18.** Алеся. **20.** Пачатак. **22.** Ля. **23.** Ёд. **24.** Падрадчык. **25.** Твор. **26.** Гоні.

**Па вертыкалі: 1.** Коннік. **3.** Сініца. **5.** Беларусь. **7.** Поўдзень. **10.** Акр. **11.** Дастатак. **12.** Тыл. **14.** Дым. **15.** Гай. **16.** Прылёт. **19.** Ягадкі. **20** Плач. **21.** Крык.

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 756 мм рт.сл. | +5..+6 °C | +8..+9 °C |
| ВІЦЕБСК | 757 мм рт.сл. | +5..+7 °C | +7..+8 °C |
| МАГІЛЁЎ | 758 мм рт.сл. | +5..+6 °C | +7..+8 °C |
| ГОМЕЛЬ | 759 мм рт.сл. | +5..+6 °C | +9..+11 °C |
| ГРОДНА | 752 мм рт.сл. | +6..+7 °C | +9..+11 °C |
| БРЭСТ | 753 мм рт.сл. | +5..+6 °C | +12..+13 °C |

Паводле даных Белгідрамета

**...у суседзяў**

МАСКВА +7..+9 °C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +6..+8 °C

**Месяц**

*Першая чвэрць 29.10–04.11. Месяц у сузор'і Вадаліва.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні: — нязначныя геамагнітныя ўзрушэнні; — слабая геамагнітная бура; — малая геамагнітная бура; — умераная геамагнітная бура



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

**29 кастрычніка** Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1945** год — нарадзіўся Мікалай Станіслававіч Казак (в. Дзешчанка Уздзенскага р-на Мінскай вобл.), беларускі вучоны, акадэмік НАН Беларусі (2003 г.), доктар фізіка-матэматычных навук. Аўтар 60 вынаходніцтваў, больш за 340 навуковых работ па крышталаптыцы, крышталеакустыцы і нелінейнай оптыцы. Выканаў даследаванні нелінейнага пераўтварэння выпраменьвання лазераў у розных крышталях і геаметрыях эксперымента з улікам рэальных параметраў лазернага выпраменьвання. Стварыў шэраг высокаэфектыўных нелінейна-аптычных пераўтваральнікаў частаты і іншых параметраў выпраменьвання лазераў розных тыпаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000 г.), прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1978 г.), кавалер ордэнаў Пашаны і Францыска Скарыны.

У свеце

**1705** — нарадзіўся Герард Фрыдрых Мілер, рускі гісторык і археолаг, член Пецярбургскай АН. У 1733—1743 гг. браў удзел у Вялікай сібірскай экспедыцыі капітан-камандора В. Берынга, арганізаванай Акадэміяй навук, у падарожжы па тэрыторыі Югры ў складзе другой Камчацкай (Вялікай Паўночнай) экспедыцыі. У 1766 г. быў прызначаны кіраўніком Маскоўскага архіва Калегіі замежных спраў. Выдаў фундаментальную працу «Гісторыя Сібіры».

**1880** год — нарадзіўся Абрам Фёдаравіч Іофе, расійскі фізік, адзін з заснавальнікаў савецкай школы фізікаў-атамшчыкаў і арганізатараў фізічных даследаванняў у СССР, акадэмік АН СССР (1925 г.), Герой Сацыялістычнай Працы (1955 г.). Аўтар навуковых прац па трываласці, пластычнасці, электраправоднасці цвёрдага цела, Дзяржаўнай прэміі СССР (1942 г.), лаўрэат Ленінскай прэміі (1961 г., пасмяротна).

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Брылевічу Ігару Максімавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 560. Індэкс 63850. Зак. № 2214.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 кастрычніка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12